ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 32-гі | № 29 (1770) | Аўторак, 9 красавіка 1963 года. | Цана 4 кап.

Дзеячы літаратуры і мастацтва! Змагайцеся за партыйнасць і народнасць, высокую ідэйнасць і мастацкае майстэрства твораў! Ярчэй адлюстроўвайце веліч і прыгажосць гераічных спраў будаўнікоў камунізма, перамогу ў нашым жыцці новых, камуністычных адносін!

ЗАКЛІКІ ЦК КПСС

ДА 1 МАЯ 1963 ГОДА

1. Няхай жыве 1 Мая—Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных, дзень адзінства і брацтва рабочых усіх краін!

2. Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

3. Няхай жыве мір і дружба паміж народамі!

4. Працоўныя Савецкага Саюза! Усе сілы на выкананне Праграмы КПСС, рашэнняў XXII з'езда партыі! Наперад, да перамогі камунізма!

5. Няхай жыве марксізм-ленінізм — вялікае рэвалюцыйнае вучэнне, магутная ідэйная зброя працоўных усяго свету!

6. Палымянае прывітанне брацкім камуністычным і рабочым партыям — баявому авангарду рабочага класа і ўсіх працоўных!

7. Няхай жыве непарушнае марксісцка-ленінскае адзінства і згуртаванасць вялікай арміі камуністаў усяго свету!

8. Вышэй сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізму!

9. Няхай мацнее адзінства дзеячаў працоўных усіх краін у барацьбе за мір, дэмакратыю і сацыялізм!

10. Свабоду ахвярам рэакцыі, вязням капіталу!

11. Народы свету! Змагайцеся за поўную і канчатковую ліквідацыю ганебнай сістэмы каланіяльнага рабства, супраць усіх форм імперыялістычнай залежнасці!

12. Народы свету! Выкрывайце антынародную, драпежніцкую сутнасць імперыялізму! Узмацняйце барацьбу супраць засілля манаполій і разгулу мілітарызму!

13. Народы ўсіх краін! Будзьце пільнымі, выкрывайце імперыялістычных падпальшчыкаў вайны! Актыўней змагайцеся за забеспячэнне трывалага і непарушнага міру!

14. Народы ўсіх краін! Рашуча змагайцеся за ўсеагульнае і поўнае раззбраенне!

15. Народы ўсіх краін! Патрабуйце заключэння германскага мірнага дагавору і ператварэння Заходняга Берліна ў вольны дэмілітарызаваны горад!

16. Няхай жыве сусветная сацыялістычная сістэма — дзецішча міжнароднага рабочага класа, магутная садружнасць свабодных, суверэнных народаў, якія ідуць па шляху сацыялізма і камунізма!

17. Брацкае прывітанне працоўным Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж вялікімі народамі Савецкага Саюза і Кітая!

18. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Албаніі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і албанскім народамі!

19. Брацкае прывітанне працоўным Народнай Рэспублікі Балгарыі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і балгарскім народамі!

20. Брацкае прывітанне працоўным Венгерскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і венгерскім народамі!

21. Брацкае прывітанне працоўным Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца за мірнае аб'яднанне сваёй краіны на дэмакратычных асновах! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і в'етнамскім народамі!

22. Брацкае прывітанне працоўным Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і германскім народамі!

Няхай жыве Германская Дэмакратычная Рэспубліка!

23. Брацкае прывітанне працоўным Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм, змагаюцца за мірнае аб'яднанне сваёй краіны на дэмакратычных асновах! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і карэйскім народамі!

24. Брацкае прывітанне гераічнаму народу Кубы, які будуе сацыялізм, самааддана адстойвае свабоду і незалежнасць сваёй радзімы ад агрэсіўных замахаў амерыканскіх імперыялістаў! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і кубінскім народамі!

25. Брацкае прывітанне працоўным Мангольскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і мангольскім народамі!

26. Брацкае прывітанне працоўным Польскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і польскім народамі!

27. Брацкае прывітанне працоўным Румынскай Народнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і румынскім народамі!

28. Брацкае прывітанне працоўным Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якія будуюць сацыялізм! Няхай жыве вечная, непарушная дружба і супрацоўніцтва паміж савецкім і чэхаславацкім народамі!

29. Брацкае прывітанне працоўным Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва савецкага і югаслаўскага народаў у інтарэсах барацьбы за мір і сацыялізм!

30. Гарачае прывітанне вялікаму індыйскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Індыі!

31. Гарачае прывітанне вялікаму інданезійскаму народу! Няхай развіваецца і мацнее дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Інданезіі!

32. Гарачае прывітанне лаоскаму народу, які стаў на шлях стварэння нейтральнага, незалежнага і дэмакратычнага Лаоса!

33. Гарачае прывітанне народам Бірмы, Цэйлона, Камбоджы, якія змагаюцца за мір і ўмацаванне нацыянальнай незалежнасці сваіх краін!

34. Гарачае прывітанне афганскаму народу! Няхай мацнеюць і развіваюцца дружалюбныя, добрасуседскія адносіны паміж Савецкім Саюзам і Афганістанам!

35. Гарачае прывітанне народам арабскіх краін, якія змагаюцца за поўную ліквідацыю каланіялізму і ўмацаванне сваёй незалежнасці!

36. Гарачае прывітанне народу Алжыра! Няхай развіваецца і мацнее дружба паміж савецкім і алжырскім народамі!

37. Гарачае прывітанне народам свабодных афрыканскіх дзяржаў, якія самааддана змагаюцца за ўмацаванне сваёй незалежнасці!

38. Гарачае прывітанне кангалезскаму народу, які змагаецца за незалежнасць і адзінства кангалезскай дзяржавы!

39. Гарачае прывітанне народам Лацінскай Амерыкі, якія змагаюцца супраць імперыялізму, за ўмацаванне незалежнасці сваіх краін!

40. Няхай жыве дружба і супрацоўніцтва народаў Англіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Францыі і Савецкага Саюза ў інтарэсах трывалага міру ва ўсім свеце!

41. Гарачае прывітанне працоўным і ўсім прагрэсіўным сілам Федэратыўнай Рэспублікі Германіі, якія змагаюцца супраць мілітарызму і адраджэння фашызму!

42. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж народамі Савецкага Саюза і Італіі!

43. Няхай жыве дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Фінляндскай рэспублікі!

44. Няхай развіваюцца і мацнеюць дружалюбныя адносіны паміж савецкім народам і народамі Швецыі, Нарвегіі, Даніі, Ісландыі!

45. Няхай жыве дружба і супрацоўніцтва паміж народамі Савецкага Саюза і Аўстрыі!

46. Гарачае прывітанне японскаму народу, які змагаецца за поўную незалежнасць сваёй краіны, супраць амерыканскіх ваенных баз, за мір і дружбу з суседнімі дзяржавамі!

47. Няхай жыве ленінская міралюбівая знешняя палітыка Савецкага Саюза!

48. Няхай жывуць авеяныя славай перамог доблесныя Савецкія Узброеныя Сілы!

49. Савецкія воіны! Дабівайцеся новых поспехаў у баявой і палітычнай падрыхтоўцы, будзьце заўсёды гатовы сакрушыць любога агрэсара!

50. Няхай жыве непарушны саюз рабочага класа і калгаснага сялянства нашай краіны!

51. Няхай жыве і мацнее непарушнае адзінства і брацкая дружба народаў СССР!

52. Працоўныя Савецкага Саюза! Усе сілы на стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма.

53. Працоўныя Савецкага Саюза! Шырэй размах усенароднага сацыялістычнага спаборніцтва! Датэрмінова выканаем план пятага года сямігодкі!

54. Слава калектывам і ўдарнікам камуністычнай працы, перадавікам і наватарам вытворчасці!

55. Працоўныя Савецкага Саюза! Усямерна ўмацоўвайце сацыялістычную ўласнасць—аснову магутнасці нашай краіны і далейшага росту дабрабыту народа!

56. Працоўныя Савецкага Саюза! Змагайцеся за няўхільнае ажыццяўленне прынцыпу будаўнікоў камунізма: хто не працуе, той не есць!

57. Працоўныя Савецкага Саюза! Настойліва павышайце прадукцыйнасць працы! Змагайцеся за найбольш поўнае выкарыстанне ўнутраных рэзерваў вытворчасці, за павышэнне якасці прадукцыі!

58. Работнікі прамысловасці, будаўніцтва і транспарту! Ажыццяўляйце комплексную механізацыю і аўтаматызацыю, смялей укараняйце ў вытворчасць дасягненні навукі, тэхнікі і перадавы вопыт!

59. Працоўныя Савецкага Саюза! Дабівайцеся эканомнага выдаткавання дзяржаўных сродкаў! Змагайцеся з безгаспадарчасцю, празмернасцямі і марнатраўствам!

60. Работнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, будаўніцтва і транспарту! Змагайцеся за найбольш разумнае і эканомнае выкарыстанне капітальных укладанняў! Сканцэнтроўвайце рэсурсы на важнейшых пускавых будоўлях!

61. Савецкія металургі і гарнякі! Павялічвайце здабычу руды, вытворчасць чыгуну, сталі, пракату, труб, каляровых і рэдкіх металаў!

62. Савецкія энергетыкі, будаўнікі і мантажнікі электрастанцый і электрасетак! Забяспечвайце апярэджваючыя тэмпы вытворчасці электраэнергіі, зніжайце кошт будаўніцтва і эксплуатацыі энергасістэм!

63. Работнікі машынабудавання і прыборабудавання! Настойліва змагайцеся за тэхнічны прагрэс і спецыялізацыю вытворчасці! Хутчэй аснашчайце народную гаспадарку найноўшымі машынамі і прыборамі!

64. Работнікі нафтавай і газавай прамысловасці! Дадзім краіне больш нафты і газу!

65. Савецкія геолагі! Хутчэй адкрывайце незлічоныя багацці нашай Радзімы!

66. Работнікі вугальнай прамысловасці! Змагайцеся за максімальнае выкарыстанне горнай тэхнікі! Зніжайце сабекошт і паляпшайце якасць вугалю!

67. Работнікі хімічнай прамысловасці! Хутчэй уводзьце ў строй і асвойвайце новыя магутнасці! Павялічвайце вытворчасць новых сінтэтычных матэрыялаў, больш вырабляйце мінеральных угнаенняў!

68. Савецкія будаўнікі! Вышэй тэмпы і якасць будаўнічых работ! Будуйце дабротныя, прыгожыя і эканамічныя будынкі і збудаванні!

69. Работнікі прамысловасці будаўнічых матэрыялаў! Развівайце будаўнічую індустрыю! Павялічвайце вытворчасць цэменту, новых будаўнічых матэрыялаў і зборных канструкцый!

70. Работнікі лясной, дрэваапрацоўчай і папяровай прамысловасці! Дадзім краіне больш драўніны, мэблі, цэлюлозы і паперы высокай якасці!

71. Работнікі лёгкай і харчовай прамысловасці! Павялічвайце вытворчасць, расшырайце асартымент, паляпшайце якасць тавараў і прадуктаў харчавання!

72. Работнікі рыбнай прамысловасці! Павялічвайце ўлоў рыбы, паляпшайце якасць і зніжайце сабекошт рыбных прадуктаў!

73. Работнікі савецкага транспарту! Удасканальвайце і аснашчайце транспарт сучаснымі тэхнічнымі сродкамі! Скарачайце тэрміны дастаўкі грузаў, лепш абслугоўвайце пасажыраў!

74. Работнікі сувязі! Развівайце і ўдасканальвайце сродкі сувязі! Паляпшайце абслугоўванне насельніцтва!

75. Працаўнікі сельскай гаспадаркі! Шырэй разгортвайце ўсенароднае спаборніцтва за ўзорнае правядзенне веснавой сяўбы, за значнае павелічэнне вытворчасці збожжа, тэхнічных культур і прадуктаў жывёлагадоўлі!

76. Работнікі сельскай гаспадаркі! Поўнасцю выкарыстоўвайце перавагі новай сістэмы кіравання! Удасканальвайце арганізатарскую работу, узнімайце ўсе калгасы і саўгасы да ўзроўню перадавых!

77. Калгаснікі, работнікі саўгасаў, сельскія механізатары! Смялей укараняйце механізацыю, дасягненні навукі і перадавы вопыт! Настойліва вывучайце, добра выкарыстоўвайце і беражыце тэхніку!

78. Калгаснікі і работнікі саўгасаў! Усямерна развівайце грамадскую жывёлагадоўлю, умацоўвайце кармавую базу! Павялічвайце вытворчасць мяса, малака, масла, яек і іншай прадукцыі!

79. Працаўнікі цалінных зямель! Змагайцеся за павышэнне культуры земляробства! Усямерна развівайце грамадскую жывёлагадоўлю!

80. Калгаснікі і калгасніцы! Развівайце калгасную дэмакратыю! Калгас — школа камунізма для сялянства!

81. Работнікі гандлю, грамадскага харчавання і камунальна-бытавой гаспадаркі! Змагайцеся за высокую культуру абслугоўвання насельніцтва!

82. Работнікі савецкіх устаноў! Узмацняйце арганізатарскую і выхаваўчую работу ў масах! Выкараняйце бюракратызм, чула адносьцеся да патрэб і запатрабаванняў працоўных!

83. Работнікі навукі і вышэйшых навучальных устаноў! Змагайцеся за далейшы росквіт навукі, за тэхнічны прагрэс. Рыхтуйце спецыялістаў, вартых эпохі камунізма!

Слава перадавой савецкай навуцы!

84. Слава савецкім вучоным, канструктарам, інжынерам, тэхнікам і рабочым — стваральнікам выдатных касмічных караблёў!

Слава доблесным савецкім касманаўтам!

85. Дзеячы літаратуры і мастацтва! Змагайцеся за партыйнасць і народнасць, высокую ідэйнасць і мастацкае майстэрства твораў! Ярчэй адлюстроўвайце веліч і прыгажосць гераічных спраў будаўнікоў камунізма, перамогу ў нашым жыцці новых, камуністычных адносін!

86. Работнікі друку, радыё і тэлебачання, выдавецтваў і культурна-асветных устаноў! Будзьце баявымі памочнікамі партыі ў яе барацьбе за перамогу камуніма!

87. Работнікі народнай асветы! Павышайце якасць навучання дзяцей, выхоўвайце іх у духу працевітасці, калектывізму, адданасці справе камунізма!

88. Медыцынскія работнікі! Паляпшайце абслугоўванне працоўных! Укараняйце ў практыку найноўшыя дасягненні медыцынскай навукі!

89. Няхай жыве наша агульнанародная сацыялістычная дзяржава!

90. Няхай жывуць Саветы дэпутатаў працоўных— сапраўды народныя органы ўлады!

Няхай развіваецца і мацнее савецкая сацыялістычная дэмакратыя!

91. Няхай жывуць савецкія прафсаюзы — школа камунізма!

92. Няхай жывуць савецкія жанчыны — актыўныя будаўнікі камуністычнага грамадства!

93. Няхай жыве Ленінскі камсамол — верны памочнік і рэзерв Камуністычнай партыі!

94. Юнакі і дзяўчаты! Настойліва вучыцеся працаваць і жыць па-камуністычнаму!

Няхай жыве слаўная савецкая моладзь!

95. Піянеры і школьнікі! Упорна авалодвайце ведамі, любіце і паважайце працу! Рыхтуйцеся стаць актыўнымі барацьбітамі за справу Леніна, за камунізм!

96. Камуністы і камсамольцы! Будзьце ў авангардзе ўсенароднай барацьбы за пабудову камунізма ў СССР!

97. Слава вялікаму савецкаму народу — доблеснаму будаўніку камунізма, мужнаму барацьбіту за мір і шчасце ўсіх людзей на зямлі!

98. Няхай жыве вялікае непарушнае яднанне партыі і народа!

99. Няхай жыве Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

100. Няхай жыве наш родны Савецкі ўрад!

101. Няхай жыве створаная Леніным слаўная Камуністычная партыя Савецкага Саюза!

102. Няхай жыве камунізм, які ўсталёўвае на зямлі Мір, Працу, Свабоду, Роўнасць, Брацтва і Шчасце ўсіх народаў!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

Ён пакуль што толькі вучань гарадскога прафесіянальна-тэхнічнага вучылішча, але яму ўжо даверана самастойная кладка сцен саракавасьмікватэрнага дома, які будуецца па Магілёўскай шашы. Вось чаму ў Фёдара Гіля такі цудоўны настрой.

Цагліна кладзецца за цаглінай... Колькі радасці прыносіць людзям кожны новы дом. Сапраўды, прафесія будаўніка — цудоўная прафесія!

Фота Т. ІВАНОВА.

«МЕСЯЦ-4» ВЫКАНАЎ ПРАГРАМУ

У 4 гадзіны 24 мінуты 6 красавіка аўтаматычная станцыя «Месяц-4» прайшла над паверхняй Месяца на адлегласці 8.500 кіламетраў.

Эксперыменты і вымярэнні, якія праводзіліся з дапамогай станцыі «Месяц-4», закончаны. Радыёсувязь са станцыяй будзе працягвацца некалькі дзён.

Атрыманы вялікі эксперыментальны матэрыял, які мае вялікае значэнне для вырашэння раду тэхнічных праблем, звязаных з асваеннем Месяца. Даныя вымярэнняў апрацоўваюцца і вывучаюцца ў навуковых цэнтрах краіны, якія вядуць даследаванні касмічнай прасторы.

У сваім далейшым палёце станцыя «Месяц-4» на працягу 1963 года будзе абарачацца вакол Зямлі па выцягнутай арбіце. Максімальнае аддаленне станцыі ад Зямлі на першым вітку складзе прыкладна 700 тысяч кіламетраў, мінімальнае — каля 90 тысяч кіламетраў. У выніку ўплыву прыцягнення Сонца і Месяца арбіта руху станцыі «Месяц-4» з цягам часу зробіць значнае адхіленне. У выніку гэтага станцыя выйдзе са сферы дзеяння зямнога прыцягнення і ператворыцца ў штучны спадарожнік Сонца.

На гэтым публікацыі паведамленняў ТАСС аб руху станцыі «Месяц-4» заканчваюцца.

У КАМІТЭЦЕ ПА ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

6 красавіка пад старшынствам М. С. Ціханава адкрылася красавіцкая сесія Камітэта па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва. У яе рабоце прымаюць удзел вядомыя дзеячы культуры Масквы, Ленінграда, саюзных рэспублік.

У гэтым годзе савецкая грамадскасць прыняла актыўны ўдзел у абмеркаванні работ, вылучаных на атрыманне Ленінскіх прэмій. Асабліва шмат водгукаў працоўных паступіла аб творах выяўленчага мастацтва, экспанаваных на выстаўцы Камітэта ў Акадэміі мастацтваў СССР.

Пасля вывучэння матэрыялаў грамадскага абмеркавання і дыскусіі па кандыдатурах, пакінутых для ўдзелу ў конкурсе, будзе прынята рашэнне аб прысуджэнні Ленінскіх прэмій 1963 года.

ТАСС.

ТВОРЧАЯ СПРАВАЗДАЧА

Нядаўна ў Мінску, у памяшканні салона-магазіна Мастацкага фонду адкрылася выстаўка твораў вядомага савецкага жывапісца, заслужанага дзеяча мастацтва РСФСР, сапраўднага члена Акадэміі мастацтваў СССР Г. Ніскага і аднаго з буйнейшых майстроў савецкага графічнага мастацтва, народнага мастака РСФСР Г. Вярэйскага.

Творчасць Г. Ніскага прысвечана паказу прыроды, ператвораной працаю чалавека. Яго пейзажы прасякнуты лірычным пачуццём, вызначаюцца прыўзнятай трактоўкай вобраза.

Ураджэнец Беларусі Г. Ніскі праз усё жыццё пранёс вялікую любоў да беларускага пейзажу. На выстаўцы прадстаўлена каля 120 эцюдаў мастака. Яны лаканічныя, арыгінальныя і непаўторныя. Сярод экспанатаў выстаўкі — работы «Аёрны край», «Ля прычала», «Берагі Азова», «Асенні матыў» і іншыя.

Г. Вярэйскі працуе ў асноўным ў галіне партрэта і пейзажа. Ён стварыў вдзіную ў сваім родзе партрэтную галерэю нашых сучаснікаў. Яго творчасць прадстаўлена на выстаўцы 40 графічнымі працамі. Гэта партрэты артыста М. Чаркасава, дырыжора Я. Мравінскага, пісьменніка А. Талстога, мастачкі Е. Табаковай і інш.

З ГЛЫБОКАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ

АРТЫСТЫ АДАБРАЮЦЬ

Аб рэалістычных традыцыях тэатра, яго рэпертуары, аб выхаванні маладых артыстаў гаварылі работнікі Акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы на сваім агульным сходзе, прысвечаным вынікам сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі. Даклад аб задачах творчага калектыву зрабіў дырэктар тэатра Г. Таран. Ён сказаў:

— Мы павінны ствараць хвалюючыя спектаклі аб нашым сучасніку — герою сямігодкі. Натхнёная праца савецкага чалавека, яго думкі і творчыя планы, барацьба за мір ва ўсім свеце — вось што павінна хваляваць сёння кожнага артыста.

Пісьменнік І. Шамякін падзяліўся сваімі ўражаннямі ад памятных сустрэч у Крамлі, расказаў аб новых творах савецкай літаратуры.

Галоўны рэжысёр тэатра Ю. Шчарбакоў і народны артыст БССР Л. Рахленка гаварылі аб ролі мастацтва ў камуністычным выхаванні савецкага чалавека, аб задачы стварэння яркіх спектакляў пра сучасніка, аб партыйнасці і народнасці мастацтва.

СЛУХАЧАМ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ

Рэалістычныя творы сучаснай савецкай літаратуры, тэатральнага мастацтва і кіно — у цэнтры ўвагі слухачоў народнага універсітэта, які працуе пры Мінскім Палацы культуры прафсаюзаў. Слухачы універсітэта — рабочыя, служачыя, хатнія гаспадыні — з цікавасцю знаёмяцца з гісторыяй развіцця сацыялістычнага мастацтва.

Яны праслухалі ўжо лекцыі аб творчасці М. Горкага, Ул. Маякоўскага, М. Шолахава, А. Твардоўскага, сустракаліся з беларускімі пісьменнікамі. «Асноўныя праблемы развіцця сучаснага савецкага тэатра», «Савецкае кіно ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Вобраз сучасніка—будаўніка камунізма на экране» — вось тэмы лекцый, прачытаных нядаўна ва універсітэце культуры. Для слухачоў універсітэта будуць праведзены таксама заняткі на тэмы «Вобраз Ул. І. Леніна на экране» і «Новае ў кіно».

ПІСЬМЕННІКІ І МАСТАКІ Ў РАБОЧЫХ

Гэтымі днямі ў клубе штампавальнага цэха завода «Строммашына» пісьменнікі і мастакі Магілёва сустрэліся з членамі брыгад і ўдарнікамі камуністычнай працы.

Пісьменнік П. Шасцерыкоў расказаў аб выніках сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва. Паэты В. Матэвушаў, А. Пысін і А. Канапелька прачыталі свае новыя вершы. Мастакі А. Кандрусевіч і Э. Карповіч пазнаёмілі рабочых з творчымі планамі і абяцалі дапамагчы рабочым у афармленні цэха і выпуску насценных газет. Старшыня цэхавага камітэта тав. Сілкін расказаў, як калектыў штампавальнага цэха змагаецца за права называцца цэхам камуністычнай працы.

Пісьменнікі і мастакі вырашылі напісаць аб лепшых працаўніках цэха вершы, рэпартажы, нарысы і партрэты.

ГУТАРКІ ПРА МАСТАЦТВА

Жыхары гарадоў і раённых цэнтраў рэспублікі шчыра цікавяцца творамі сучаснага мастацтва. Яны часта запрашаюць да сябе ў госці беларускіх мастакоў і мастацтвазнаўцаў.

Так, А. Гугель нядаўна быў у Пухавічах. У мясцовым Доме культуры ён расказаў рабочым і інтэлігенцыі горада аб шляхах развіцця сучаснага выяўленчага мастацтва.

У Пружанах, ва універсітэце культуры, сельскагаспадарчым тэхнікуме і іншых установах выступіў М. Тарасікаў. Тэма яго лекцыі — «Мастацтва на службе народа».

Чытачы Барысаўскай бібліятэкі імя Я. Купалы праслухалі лекцыю пра мастацтва і сучаснасць. Прачытаў яе Л. Лейтман.

Лекцыі і гутаркі пра мастацтва былі праведзены таксама ў Белдзяржпраекце, на мінскай фабрыцы «Камунарка» і іншых прадпрыемствах.

ВЫСТАЎКІ І ВЕЧАРЫ

Кірунак далейшай працы работнікам Дзяржынскай раённай бібліятэкі падказалі нарады па пытаннях літаратуры і мастацтва ў Маскве. Бібліятэкары намецілі рад мерапрыемстваў, якія прыцягнулі ўвагу наведвальнікаў бібліятэкі.

Тут падрыхтавана вялікая тэматычная паліца «Мастацтва на службу народу», дзе сабраны разнастайныя матэрыялы — тэксты выступленняў М. С. Хрушчова і Л. Ф. Ільічова, газетныя артыкулы, кнігі аб сацыялістычным рэалізме, картатэка лепшых твораў савецкіх пісьменнікаў.

У чытальнай зале наведвальнікі бібліятэкі арганізавалі чытанне і абмеркаванне матэрыялаў сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва.

Работнікі бібліятэкі рыхтуюць тэматычны вечар «Творыць для народа, у імя камунізма». У вечары прымуць удзел чытачы, удзельнікі мастацкай самадзейнасці. Вечар адбудзецца ў клубе райпрамкамбіната.

ПРАПАГАНДУЮЦЬ МУЗЫЧНЫЯ ВЕДЫ

Беларускія кампазітары і музыказнаўцы шырока прапагандуюць музычныя веды сярод насельніцтва. Яны часта выступаюць у палацах культуры, заводскіх клубах, у аўдыторыях вну, школах.

«Музыка і сучаснасць» — такую лекцыю музыказнаўца А. Ракава прачытала ва універсітэце культуры домакіраўніцтва № 2 Ленінскага раёна. У Мінскім Доме культуры мясцовай прамысловасці музыказнаўца Л. Мухарынская расказала аматарам музыкі пра савецкую оперу.

Кампазітар Ю. Семяняка сустракаўся са студэнтамі Белдзяржуніверсітэта і вучнямі 27 школы. Ён расказаў ім аб сваёй творчасці. Затым артысты Тэатра оперы і балета выканалі яго творы.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

□ Гэтымі днямі адбыўся сход навуковых работнікаў аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Даклад «Вынікі сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі і задачы ўстаноў аддзялення» зрабіў дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору акадэмік П. Глебка.

На сходзе выступілі доктар гістарычных навук І. Краўчанка, доктар філалагічных навук В. Барысенка, кандыдат філалагічных навук В. Івашын і іншыя.

□ Студэнты і выкладчыкі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі вывучаюць матэрыялы сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва.

Абмяркоўваючы вынікі сустрэч у Крамлі, яны ўнеслі рад прапаноў, якія будуць садзейнічаць падрыхтоўцы і выхаванню музычных кадраў рэспублікі.

„Святло і цені" — новы беларускі балет

Новы спектакль — гэта новая старонка ў гісторыі тэатра, часам нават наступны этап у яго творчай працы.

У апошні час нашу ўвагу ўсё больш прыцягваюць новыя пастаноўкі Беларускага тэатра оперы і балета, калектыў якога настойліва імкнецца распрацоўваць у музычна-сцэнічным мастацтве надзённыя тэмы савецкай рэчаіснасці. Пра гэта якраз сведчыць і апошняя балетная прэм'ера тэатра — «Святло і цені» Г. Вагнера, прысвечаная вобразам нашых сучаснікаў, барацьбе з усім тым, што перашкаджае нашаму шчаслівому, радаснаму жыццю.

Сёння мы змяшчаем артыкулы пра гэты балет.



Фінальная сцэна спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

НОВЫ балет на сцэне тэатра... Велізарнейшая творчая праца многіх людзей стаіць за ім. Асабліва калі гэта спекталь аб нашай сучаснасці. Тут патрабуюцца смелыя пошукі, багатая фантазія, пачуццё новага. Не заўсёды на гэтым шляху аўтара і пастаноўшчыкаў чакаюць ружы — часцей гэта бываюць калючкі.

Новы балет нашага опернага тэатра «Святло і цені» створаны па матывах вядомага рамана лаўрэата Ленінскай прэміі Петруся Броўкі «Калі зліваюцца рэкі». Вядома, увасобіць у балетным спектаклі ўсе падзеі рамана — справа немагчымая. І таму драматург М. Алтухоў узяў з яго толькі адну сюжэтную лінію, развіўшы і пасвойму «прачытаўшы» яе. Лібрэта апавядае аб гарачым і шчырым каханні беларускага юнака Алеся і літоўскай дзяўчыны Анежкі, шчасцю якіх перашкаджаюць бацька дзяўчыны — рэлігійны фанатык і ўся цёмная зграя мясцовых сектантаў.

Для сапраўднага поспеху кожнага опернага ці балетнага спектакля неабходна, каб лібрэта было ў першую чаргу добрай і цікавай п'есай. Разглядаючы лібрэта «Святла і ценяў» з гэтых пазіцый, заўважаеш у ім даволі сур'ёзныя хібы.

Сучаснасць таго або іншага твора вызначаецца не толькі тым, што дзеянне яго адбываецца ў нашы дні, а перш за ўсё вобразам сапраўднага героя нашага часу — чалавека, адухоўленага перадавымі ідэалямі грамадства, носьбіта лепшых, характэрных для сённяшняга дня маральных прынцыпаў. Безумоўна, такі чалавек павінен мець моцны характар, быць смелым, прынцыповым. І калі ў рамане П. Броўкі Алесь паўстае перад намі менавіта такім, то ў лібрэта М. Алтухова ён траціць свае лепшыя рысы і ператвараецца ў нейкага інертнага і залішне стрыманага «блакітнага героя». Не знайшлося месца ў лібрэта і для яркай, выразнай характарыстыкі савецкай моладзі. У першай карціне балета некалькі дзесяткаў юнакоў і дзяўчат дазваляюць бацьку Анежкі сілком забраць сваю дачку са свята, а ў трэцяй — цяжка параніць яе. І толькі ў карціне сектанцкай оргіі моладзь выступае больш-менш маналітна (хаця тут не абышлося без налёту плакатнасці). Не зусім ярка паказаны ў лібрэта характары і ўчынкі іншых станоўчых дзеючых асоб. Затое больш яскрава і дакладна абмалёваны адмоўныя героі (бацька Анежкі, Жанчына ў чорным, сектанты).

Лібрэта М. Алтухова, пры пэўных знешніх прыкметах сюжэтнага развіцця, усё ж нестае сапраўднай, глыбокай драматургіі.

На такой першаасноове пачалася праца другога аўтара балета — кампазітара Г. Вагнера. І забягаючы крыху наперад, хочацца сказаць, што якраз музыка балета пакідае самае моцнае ўражанне сярод іншых кампанентаў новага спектакля.

Адмаўляючыся ад нумарнога прынцыпу пабудовы, Г. Вагнер імкнецца пакласці ў аснову музычнай тканіны твора скразное сімфанічнае развіццё. Багатым матэрыялам для такога развіцця з'яўляюцца самыя разнастайныя па характару тэмы — ад празрыста-лірычных да востра-дынамічных і гераічных. Супрацьстаўляючы ўсе гэтыя тэмы ў розных спалучэннях і распрацоўваючы іх, кампазітар удала і пераканаўча вырашае музычную драматургію спектакля. Праўда, музыка першай і чацвёртай карцін балета мае пэўны характар дывертысментнасці, што запавольвае шырокае сімфанічнае развіццё музыкі.

Музычныя характарыстыкі галоўных дзеючых асоб балета напісаны кампазітарам ярка, выразна і памагаюць псіхалагічнаму раскрыццю сцэнічных вобразаў.

ПЛАСТЫКА ГУКАЎ

Д. ЖУРАЎЛЁЎ

Большасць з іх пабудавана на лейттэмах, якія ў працэсе дзеяння трансфарміруюцца, набываюць больш шырокае гучанне. Так, напрыклад, лірычная, крыху сумная і «разгубленая» ў першай дзеі лейттэма Анежкі далей становіцца больш светлай, шырокай і ўпэўненай. Прыкладна тое ж адбываецца і з лейттэмай Алеся. Афарбаваная спачатку ў лірычныя таны, яна потым набывае рысы актыўныя, рашучыя і валявыя.

Цікавае музычнае ўвасабленне атрымаў вобраз бацькі Анежкі: яго лейттэма будуецца на кароткай, жорсткай мелодыі ў суправаджэнні тупых дысаніруючых акордаў, што вельмі трапна раскрывае вобраз абмежаванага і злоснага фанатыка.

Пачынаецца спектакль невялікім уступам ці інтрадукцыяй, пабудаванай на супрацьпастаўленні светлай, лірычнай тэмы Анежкі і тупой і злоснай тэмы яе бацькі. У музычную тканіну інтрадукцыі ўплятаецца і тэма Алеся.

Непасрэдна за інтрадукцыяй ідзе тэмпераменты і хуткі маладзёжны танец, на фоне якога разгортваецца сцэнічнае дзеянне. Яго змяняе латышскі танец, пабудаваны на тэме народнага танца «Цірулі, цірулі», а потым рускі (на арыгінальным музычным матэрыяле з выкарыстаннем асобных інтанацый рускіх народных танцаў). Пасля выхаду Алеся пачынаецца павольны танец, які як бы заканчвае, акаймоўвае своеасаблівую танцавальную сюіту.

Даволі яркае музычнае ўвасабленне ў першай дзеі балета атрымалі выхад і варыяцыя Анежкі і кантрасны ім гумарыстычны танец сяброўкі Анежкі — Марты, які мае імклівы скерцозны характар з вострай гарэзлівай гармоніяй. Запамінаецца першае адажыо з шырокай, напеўнай музыкай лірычнага плана і ўсхваляванай сярэдняй часткай. Вялікага драматычнага напружання дасягае музыка ў сцэне з'яўлення бацькі Анежкі.

Найбольш яскрава праявіўся талент кампазітара ў музыцы другой дзеі балета (оргія сектантаў). Тут, малюючы сродкамі музычнай мовы варожы і цёмны свет рэлігійных фанатыкаў, кампазітару не цяжка было перабольшыць, перайсці ў гратэск. Аднак, на маю думку, гэтага не здарылася і музыка на працягу ўсёй дзеі рэалістычная. Амаль уся яна (за выключэннем тэмы Анежкі, «наплыву», калі ў музыцы гучыць тэма першага адажыо і трансфармаванай, валявой і мужнай тэмы Алеся) пабудавана на вуглаватай, ламанай і тупой кароткай музычнай тэме з нязменнай «асцінатнай» фігурай у басе. Музыка гучыць спачатку ціха, павольна, потым да мелодый далучаюцца ўсё новыя і новыя аркестравыя галасы, яна мацнее, становіцца больш напружанай і дзікай, на яе накладваюцца ўсё больш складаныя і вострыя гарманічныя напластаванні, усё больш сінкапіраваным становіцца рытм, усё часцейшымі танальныя зрухі. У кульмінацыйным пункце рэлігійнай оргіі ў магутнае гучанне аркестра ўплятаецца жаночы хор, які ў высокім рэгістры выкрыквае кароткія музычныя фразы, нібы воклічы і галашэнне рэлігійных клікуш. Усё гэта ў спалучэнні са сцэнічным дзеяннем пакідае вельмі моцнае ўражанне, якое можна параўнаць з уражаннем ад першай часткі Сёмай сімфоніі Д. Шастаковіча.

Здавалася б, што пасля такой яркай і напружанай дзеі з такой моцнай музычнай кульмінацыяй далейшае развіццё музычнага матэрыялу не зможа быць дастаткова ўражлівым і шырокім. Аднак кампазітар здолеў давесці, што гэта не так. Музыка трэцяй і чацвёртай карцін балета мае рад дадатных якасцей. Не разбіраючы падрабязна усіх музычных нумароў, адзначу толькі найбольш цікавыя і значныя з іх.

У першую чаргу гэта — адажыо з трэцяй карціны, больш разгорнутае і складанае, чым першае. Калі адажыо з першай дзеі было афарбавана ў лірычныя таны, то другое — больш усхваляванае, палкае, драматычна насычанае і светлае. Яно як быццам паказвае радасць жыцця, радасць Анежкі, вызваленай ад цяжкіх рэлігійных путаў. Пераканаўчае ўвасабленне ў музыцы знайшла сцэна Анежкі з бацькам і Алесем і фінал трэцяй карціны. У гэтай сцэне бацька пераходзіць ад пагроз да прынижаных просьбаў, а потым, асляплены фанатызмам, кідаецца на дачку з нажом. Гэта адна з найбольш драматычных па музыцы сцэн балета, у якой, дарэчы, кампазітар выкарыстаў даволі рэдкі ў балетнай музыцы паліфанічны прыём, напісаўшы сцэну барацьбы Алеся з бацькам Анежкі ў форме фугата.

Цікавае музычнае ўвасабленне знайшла і чацвёртая карціна балета. Жадаючы неяк адступіць ад традыцыйнага ўжо ў беларускіх балетах і операх выкарыстання такіх народных танцаў, як «Крыжачок», «Лявоніха», «Юрачка», «Бульба», кампазітар у якасці музычнага матэрыялу ўзяў не танцавальныя мелодыі, а беларускія народныя песні: традыцыйную «Ой, рэчанька, рэчанька» і сучасную «Прыпеўкі пра калгаснае жыццё». З сапраўдным кампазітарскім майстэрствам зроблены і фінал балета, дзе на народную тэму напластоўваецца арыгінальная — блізкая па характару да народнай. Тут жа ўзнікае тэма вялікага адажыо з водгукамі тэм Анежкі і Алеся.

Музыка ўсяго балета цалкам вызначаецца эмацыянальнай насычанасцю, дынамічнасцю, рытмічнай і танальнай разнастайнасцю. Ад першага да апошняга такта яна надзвычай танцавальная і, разам з тым, меладычная. Інтанацыйная і гарманічная мова кампазітара свежая і па-сапраўднаму сучасная.

Нельга не адзначыць і добрай аркестроўкі. У партытуры балета поўна выкарыстоўваюцца асобныя аркестравыя групы і інструменты, ёсць нямала сольных эпізодаў, надзвычай удала ўводзіцца гучанне хору (у беларускай балетнай музыцы гэта першая спроба). Разам з тым партытура балета «шчыльная» і напісана з добрым веданнем аркестравай фактуры. Частая змена рэгістраў, тэмбраў, спалучэнняў розных аркестравых груп надае музыцы балета асаблівую маляўнічасць і разнастайнасць.

Узбагачае музыку і тое, што кампазітар часта карыстаецца прыёмамі паліфанічнага пісьма, добра распрацоўвае падгалосачны матэрыял (і асабліва за лік тэмбральных падгалоскаў).

Ці можна лічыць «Святло і цені» балетам нацыянальным па музычнай мове? Так! І не толькі таму, што ў ім цытуюцца беларускія народныя песні, але і таму, што амаль увесь інтанацыйны матэрыял балета мае яскравы нацыянальны каларыт ды і некаторыя нумары яго аркестраваныя ў народным стылі (напрыклад, карагод з першай дзеі і іншыя). Разам з тым нельга не заўважыць, што ў першай дзеі балета, дзе як бы даюцца музычныя характарыстыкі асобных нацыянальных груп моладзі (рускія, беларусы, латышы, літоўцы), не хапае беларускага танца. Хацелася б, каб і музычная характарыстыка галоўнага героя балета — Алеся была акрэслена нацыянальна больш яскрава. Не хапае, на маю думку, у першай дзеі і разгорнутай варыяцыі Алеся, якая б сродкамі музычнай драматургіі і харэаграфіі больш поўна раскрыла ўнутраны свет героя.

Вялікую працу прарабіў аркестр тэатра для музычнага ўвасаблення балета Г. Вагнера. Мне здаецца, што дырыжору, народнаму артысту рэспублікі Л. Любімаву разам з музыкантамі ўдалося знайсці патрэбныя фарбы і даволі поўна раскрыць задуму кампазітара. Значныя аркестравыя цяжкасці балетнай партытуры калектыў пераадолеў у меру сваіх сіл і магчымасцей. Гэта прыемна адзначыць яшчэ і таму, што аркестр тэатра невялікі ды і загружаны штодзённымі спектаклямі і рэпетыцыямі, і для таго, каб падрыхтаваць новы складаны твор, ён павінен валодаць сапраўдным энтузіязмам і творчым гарэннем. І няхай іншы раз бываюць не вельмі дасканалымі нюансы, а ў некаторых месцах духавыя пераважаюць над струннымі (струнная група аркестра надзвычай малая) — усё ж трэба сказаць, што калектыў на чале з дырыжорам самааддана папрацаваў над новым цікавым творам беларускай музыкі.

КАМПАЗІЦЫЯ І ПАСТАНОЎКА

Агульнавядома, наколькі цяжка адлюстраваць рэальнае жыццё сённяшняга дня сродкамі ўмоўнага опернага або балетнага мастацтва. Куды лягчэй узяць казку, легенду, выкарыстаць які-небудзь фантастычны або экзатычны матэрыял, што звычайна і робіцца ў балетных спектаклях.

А ці шмат створана балетаў на сучасную тэму ў нас у краіне? Не, не шмат!

А ў Беларусі? Першы нацыянальны балет на сучасную тэму з'явіўся зусім нядаўна. Гэта — «Мара» (кампазітар Я. Глебаў, балетмайстар А. Андрэеў), якая атрымала добрую ацэнку і прызнанне гледачоў. Не мінула яшчэ і двух гадоў, а тэатр зноў выступіў з новым балетам на сучасную тэматыку — «Святло і цені» кампазітара Г. Вагнера.

Гэты спектакль быў задуманы пасля таго, як з'явіўся раман «Калі зліваюцца рэкі» лаўрэата Ленінскай прэміі Петруся Броўкі. Выкарыстаўшы адну з сюжэтных ліній гэтага твора, аўтар лібрэта М. Алтухоў расказаў пра страшэнны перажытак мінулага, што быццам яшчэ ў наш час,— рэлігійнае цемрашальства сектантаў, а таксама пра жыццесцвярджальнае каханне і перамогу шчасця ва ўмовах савецкай рэчаіснасці.

Змест балета далёка выходзіць за рамкі любоўнага канфлікту, хоць лірычныя сцэны ў ім займаюць значнае месца.

Гэты спектакль нясе ў сабе вялікія грамадзянскія матывы. Ён гнёўна выкрывае розныя праявы цемрашальства, рэлігійнага дурману. Па сутнасці гэта першы савецкі балет на атэістычную тэму.

Першае дзеянне. Моладзь сабралася на гуляніе, відаць, недзе ў раёне возера Дрысвяты — там, дзе пабудавана міжрэспубліканская калгасная электрастанцыя, якая запаліла лямпачку Ільіча ў калгасах Літвы, Латвіі і Беларусі. Латвійскі танец змяняецца рускім. У музыцы і харэаграфіі выкарыстаны таксама матывы беларускай і літоўскай народнай творчасці. У гэтым акце адчуваецца імкненне аўтараў балета падкрэсліць тэму непарушнай дружбы нашых народаў, яе маналітнасць і адзінства.

У першым жа акце ўзнікае канфлікт паміж Алесем, Анежкай і яе бацькам. Ён пачынаецца ў лірычных сцэнах Алеся і скаванай забабонамі Анежкі.

Другі акт, па агульнаму прызнанню, самы ўдалы. У музыцы, у танцы, у такім эмацыянальным магутным сродку, як харал,— аўтары дасягаюць сапраўдных вышынь эстэтычнага ўздзеяння на слухачоў і гледачоў.

У трэцім акце дзейсную аснову мае толькі першая карціна. У ёй злачынца-бацька замахваецца на жыццё сваёй дачкі. Далей ідуць лірычныя карціны пораў года, цудоўна распрацаваная Г. Вагнерам для сімфанічнага аркестра беларуская народная песня «Ой, рэчанька, рэчанька...» і, нарэшце, даволі звычайны фінал.

Драматургія і музыка дыктуюць пастаноўшчыку многае, але пастаноўшчык новага балетнага спектакля — гэта не проста харэограф, які ставіць танец. Не выпадкова ў праграме ўказана: кампазіцыя і пастаноўка балетмайстра заслужанага артыста РСФСР А. Андрэева, балетмайстар — заслужаная артыстка РСФСР Н. Стукалкіна. Яны з'яўляюцца, побач з кампазітарам, галоўнымі аўтарамі сцэнічнага твора балетнага мастацтва.

З сямі пастаўленых беларускіх балетаў стваральнікамі харэаграфіі двух новых спектакляў з'яўляюцца А. Андрэеў і Н. Стукалкіна (прычым абодва балеты арыгінальныя, нідзе не ішлі раней). Таму падыходзіць да вынікаў іх работы можна без скідак, сур'ёзна, з сапраўднай творчай патрабавальнасцю.

Так, нас не задавальняе дывертысментнасць сюжэта і харэаграфіі ў першым акце. Танцы народаў СССР і лірычныя танцавальныя фрагменты Анежкі і Алеся, цікавыя самі па сабе, не памагаюць драматургіі твора ўвогуле.

Асабліва недасканалы трэці акт. Дзеянне заканчваецца па сутнасці ў першай карціне гэтага акта, але яна не завяршае барацьбу святла і ценяў, у імя чаго пастаўлены ўвесь балет. Моладзь, да якой імкнецца Анежка, пакуль што мала дзейсная. Алесь тут таксама выступае нейкім бездапаможным, бо ён не здолеў (незразумела чаму) абараніць сваю каханую ад здрадніцкага нажа. А пасля таго, як паранена Анежка, ідуць бяздзейныя карціны: «Поры года», «Рэчанька» — танец, пастаўлены ў плане караводу, ў вельмі інтымна-лірычных танах. Атрымліваецца разрыў паміж напружанасцю другога акта ў сцэне сектантаў і расслабленасцю, нейкай нядужасцю нашай моладзі. Гэта — прыкрая памылка.

Вырашэнне асноўных вобразаў балета аўтарам таксама яшчэ не зусім удалося. У драматургічных і харэаграфічных адносінах, бадай, лепшым станоўчым вобразам спектакля з'яўляецца Анежка. Гэта — складаны, глыбока драматычны характар, які развіваецца ў ходзе спектакля. Анежка вырастае на вачах у гледача з запалоханай, ачмуранай рэлігійным дурманам дзяўчыны ў чалавека, што ўсвядоміў свае памылкі і цвёрда парваў са светам мінулага. У харэаграфіі пераканаўча праводзіцца гэтае развіццё вобраза ад лірычнага адажыо, пабудаванага на нясмелым плаўным класічным малюнку (у першым акце, у сцэне пакорлівага падпарадкавання ўладзе бацькі, дзе толькі зараджаюцца моманты вагання і пратэсту), да адкрытага непаслушэнства і выхаду з секты (другі акт). У трэцім акце танец Анежкі набывае новыя рысы — аптымізм, радасць, упэўненасць.

Выканаўцы ролі Анежкі — заслужаная артыстка рэспублікі Н. Давідзенка і І. Савельева — раскрываюць вобраз гераіні кожная індывідуальна. Н. Давідзенка больш увагі звяртае на ўнутраны змест ролі, ужывае тонкія псіхалагічныя нюансы. І. Савельева вабіць тэхнічным выкананнем, завершанасцю харэаграфічнага малюнка.

Выканаўцы партый Алеся — заслужаныя артысты БССР В. Міронаў і В. Давыдаў абмежаваны невялікай колькасцю матэрыялу, адпушчанага на гэтую ролю аўтарамі балета. У вобразе Алеся яўна не хапае валявых якасцей як у дзейнай аснове сюжэта, так і ў харэаграфіі. У адажыо і ў першым і ў трэцім актах над мужнымі гераічнымі матывамі пераважае лірычны любоўны пачатак. Вобраз Алеся патрабуе найбольшай дапрацоўкі.

Яркімі рысамі надзелены адмоўныя персанажы. Вобраз Жанчыны ў чорным у выкананні заслужанай артысткі БССР В. Крыкавай і маладой балерыны Н. Парошынай дасягае вялікай выразнасці і абагульнення. У гэтым вобразе нібы канцэнтруецца лютае і злоснае па сваёй сутнасці сектанцтва.

Запамінаецца вобраз бацькі Анежкі (заслужаныя артысты БССР Г. Мартынаў і Н. Шэхаў), хоць у яго вонкавым вырашэнні ёсць элементы традыцыйнага злачынцы. Хацелася б бачыць больш індывідуальныя і разнастайныя прыёмы класічнага вырашэння гэтага вобраза, які нясе вялікую сэнсавую нагрузку. Недастаткова пакуль яшчэ раскрыты артыстамі ўнутраныя супярэчнасці вобраза, не паказана барацьба паміж бацькоўскім пачуццём і фанатызмам сектанта.

Мы верым, што аўтары дапрацуюць спектакль і гэты твор будзе варты сучасных патрабаванняў да мастацтва.

Я. ПАРВАТАЎ.

Анежка — артыстка І. Савельева, Алесь — артыст В. Давыдаў.

СААЎТАРСТВА МАСТАКА

Тэатральны мастак, працуючы над спектаклем, актыўна пранікае ў задуму аўтара, развівае ў сабе здольнасць мысліць у прасторы не толькі жывапісными катэгорыямі, але і як рэжысёр, музыкант. Гэтыя якасці сцвярджаюць яго як сааўтара стваральнікаў сцэнічнага твора і абавязваюць падпарадкаваць жывапіс ідэйна-мастацкай канцэпцыі спектакля, яго вобразнаму і эмацыянальнаму гучанню.

Я. Чамадураў, адзін з яркіх прадстаўнікоў сучаснага тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва, настойліва і паслядоўна сцвярджае і развівае гэтыя прынцыпы. Гэта мастак вялікай культуры і эрудыцыі, мастак-рэжысёр. Афармленыя ім спектаклі вызначаюцца высокім прафесіяналізмам, вастрынёй і арыгінальнасцю вырашэння, добрым густам. Я. Чамадураў шукае заўсёды новыя, сучасныя формы, у якіх з найбольшай выразнасцю выяўляюцца ідэйная і мастацкая задума аўтара і рэжысёра.

У новай рабоце — афармленні балета «Святло і цені» Г. Вагнера Я. Чамадураў не адыходзіць ад сваіх прынцыпаў. Высокі прафесіяналізм, вастрыня кампазіцыі, лаканічнасць і стрыманасць каляровага і светлавога вырашэння ў некаторых месцах спектакля дасягаюць найвышэйшай эстэтычнай выразнасці.

Але ў нас застаецца і пачуццё нездаволенасці. У гэтым, на мой погляд, не віна, а бяда мастака.

Музыка балета вельмі цікавая і арыгінальная. Эмацыянальнасць і сучаснасць яе інтанацый натхнілі мастака на пошукі адпаведнага стылю, каларыстычных асаблівасцей і кампазіцыі афармлення. Але, на вялікі жаль, адсутнасць выразнай і цэльнай драматургічнай асновы ў музыцы балета (відавочна, з-за даволі слабага лібрэта), дывертысментнасць спектакля — усё гэта перашкодзіла стварыць абагулены, цэласны твор тэатральна-дэкарацыйнага мастацтва.

У некаторых выпадках мастак ужывае збітыя тэатральныя эфекты, знижаючы тым самым высакародныя эмоцыі, якія выклікаюцца ім жа знойдзенай выяўленчай мовай.

Навошта, скажам, спатрэбілася хісткае дрэва, якое сваёй матэрыяльнасцю і «праўдзівасцю» арганічна не звязваецца з добра напісаным заднікам у першым акце? Хіба не больш лаканічна было б пакінуць тут толькі дынамічную праекцыю воблакаў, якія так цудоўна і ўзгоднена з музыкай сплятаюцца з драматычнай сцэнай, падкрэсліваючы яе з дзіўнай рытмічнай дакладнасцю?

Выдатна задуманы і выкананы дэкарацыі другога акта. Прадумовай удачы, як мне здаецца, з'явілася тое, што гэты акт найбольш насычаны зместам, цікавай музыкай і харэаграфіяй. Тут Я. Чамадураў дасягае вялікай мастацкай сілы абагульнення і выразнасці. Аднак выклікае пярэчанне вогнішча, бутафарычнасць якога зніжае ўспрыманне добра знойдзенага вобраза сцэны, парушае каляровую гаму і палягчае сваёй тэхнічнай адкрытасцю сур'ёзнасць і драматызм сцэнічнага дзеяння. Тое ж трэба сказаць і пра аплікацыйную заслону ў інтэрмедыі — малавыразную і неахайную па выкананню.

Магчыма і не варта было выказваць столькі папрокаў увогуле добраму афармленню, калі б яно не мела прынцыпова важнага значэння. Работа гэтая эксперыментальная. У ёй, як, бадай, ні ў якой іншай рабоце, відаць актыўны ўдзел мастака ў стварэнні балета, афармленне якога ў вялікай ступені кампенсіруе драматургічныя хібы і надахопы лібрэта.

Дэкарацыя першага акта паўтараецца ў трэцім. Я ўжо адзначаў станоўчыя выяўленчыя якасці фону, на якім развіваецца, на жаль, не дзеянне, а дывертысмент са спробамі звязаць яго асобнымі сюжэтнымі сітуацыямі. Гэта, паўтараю, не натхняе мастака на глыбокі роздум. Але разам з тым нельга не папракнуць і мастака за адступленне ад сваіх прынцыпаў. Ён не пераадолеў у гэтых актах слабасці драматургіі, не ўзняўся вышэй звычайнага выяўленчага фону. Выдатна напісаны задні: бяскрайняя прастора, магутная рака, сучасная архітэктура мастоў. Разам з тым ад яго павяваe нейкім сумам, ён недастаткова ўвасабляе «святло», якое проціластаўляецца «ценю» (2 акт). Жыццярадасныя танцы, якія пераважаюць у першым і трэцім актах, знаходзяцца ў супярэчнасці з ім. І калі можна такі заднік неяк прыняць у першым акце, дзе ўнутраны свет гераіні, яе светаадчуванне, яе тэма ў музыцы зліваецца з сумнай лірыкай пейзажу, дык у трэцім акце, асабліва ў фінале, хацелася б ад яго больш аптымістычнага, мажорнага гучання. А статычнасць светлавой партытуры не садзейнічае, а паглыбляе гэтае ўражанне.

І, нарэшце, самы сур'ёзны дакор мастаку і пастаноўшчыку. Чаму засталіся зусім нявырашанымі «поры года» ў трэцім акце? Цудоўная музыка не знайшла выяўлення ў харэаграфіі і малавыразна, нецікава адлюстравана ў дэкарацыі.

Некалькі слоў пра касцюмы. Увогуле яны вельмі прыгожыя, цікавыя і выразныя. Зноў Я. Чамадураў паказаў сябе цудоўным майстрам. Яго касцюмы заўсёды тыпізаваныя і вызначаюцца вялікім густам. Пярэчанне толькі выклікаюць мужчынскія касцюмы сектантаў. Яны дэзарыентуюць гледача сваёй архаічнасцю, бо ў наш час нялёгка сустрэць дзе-небудзь падобную «экіпіроўку».

У заключэнне хочацца сказаць, што, нягледзячы на рад недахопаў, работа Я. Чамадурава над спектаклем «Святло і цені» мае прынцыповую цікавасць і вялікую мастацкую каштоўнасць.

А. ГРЫГАР'ЯНЦ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Анежка — артыстка Н. Давідзенка, Алесь — артыст В. Міронаў.

ПА СТАРОНКАХ ЧАСОПІСАЎ

„НА ГРАНІ ЗМЕШВАННЯ ПАНЯЦЦЯЎ...“

Зусім натуральна, калі мы сустракаем у друку праблемны крытычны артыкул, дык спадзяёмся, што ён дапаможа нам глыбей зразумець новыя з'явы сучаснай літаратуры, ясней убачыць кірунак яе развіцця, удакладніць сваю думку аб прачытаных творах.

І вось перад намі артыкул Алеся Яскевіча «Традыцыйнае і наватарскае» (часопіс «Маладосць», № 3). Калі меркаваць па загалоўку, прававерна было б чакаць, што гаворка ў артыкуле пойдзе аб наватарскай сутнасці нашай літаратуры, літаратуры сацыялістычнага рэалізму, якая, грунтуючыся на вялікіх прынцыпах партыйнасці і народнасці, працягваючы і развіваючы лепшыя творчыя традыцыі класікі, стварае новыя мастацкія каштоўнасці і ўносіць тым самым свой пачэсны ўклад у мастацкі прагрэс чалавецтва.

Але гэта дарэмныя спадзяванні. Артыкул першымі ж фразамі выклікае па меншай меры здзіўленне. З безапеляцыйнай катэгарычнасцю А. Яскевіч абвінавачвае беларускую літаратуру ў тым, што яна цягнецца «ў баку ад жыццёвых бітваў, недзе ў глухіх далёкіх тылах». Праўда, спачатку гэтае абвінавачванне адрасуецца да нейкіх безымянных «некаторых аўтараў», але крытык тут жа, у наступным абзацы, удакладняе сваю думку: «Адставанне нашай літаратуры...» Такім чынам, згодна «адкрыццю», зробленаму А. Яскевічам, да ліку тых, хто цягнецца ў «глухіх далёкіх тылах», непазбежна трэба аднесці і нашых лепшых майстроў слова, якія сваёй творчасцю заваявалі заслужанае прызнанне народа.

У чым жа бачыць А. Яскевіч прычыну такога трывожнага становішча, у якім, на яго думку, апынуліся пісьменнікі? Аказваецца, усе няшчасці літаратуры тлумачацца **«нізкім узроўнем культуры сучаснага мыслення** — неглыбокім роздумам і асэнсаваннем фактаў і з'яў рэчаіснасці, адсутнасцю вялікіх думак аб нашым дні» (падкрэслена намі).

Можна было б пакінуць на сумленні аўтара стылістычную бездапаможнасць гэтага прэтэнцыёзнага словазбудавання, але ж не можа не абурыць абраза, якую кідае малады крытык цэламу атраду пісьменнікаў, дакараючы іх за «нізкі ўзровень мыслення».

Дзеля таго, каб канчаткова пераканаць чытача ў тым, што наша літаратура зайшла ў тупік, А. Яскевіч супрацьпастаўляе ёй дасягненні сучаснай навукі. Аўтар і тут не прапусціў магчымасці бліснуць сваёй крытычнай пранікліваcцю. Ва ўсе папярэднія вякі, сцвярджае ён, навука займалася толькі «высвятленнем, як кажуць, «знешніх» уласцівасцей матэрыі і ўстанаўленнем фармальных сувязей паміж з'явамі прыроды».

Вось да чаго зведзены крытыкам подзвіг найвялікшых розумаў чалавецтва, якія на працягу многіх стагоддзяў сваёй самаахвярнай працай крок за крокам рыхтавалі сённяшні зорны трыумф навукі! Галілей і Капернік, Ламаносаў і Ньютан, Мендзелееў і Сечанаў — усе яны, аказваецца, займаліся толькі «ўстанаўленнем фармальных сувязей паміж з'явамі прыроды»...

Робячы экскурс у свет навукі, крытык спрабуе, так сказаць, «наглядна» давесці неабходнасць раскаваных «якасна новых форм мыслення» ў мастацкай творчасці, у чым ён бачыць галоўную ўмову паспяховага развіцця літаратуры, якая б «упоравень з навукай асвятляла складанасць сучаснага свету». Так, па сутнасці, ставіцца знак роўнасці паміж такімі формамі грамадскай свядомасці, як навука і літаратура.

Ці варта нагадваць, што ў кожнай з іх свой адметны шлях пазнання свету, свая спецыфіка? Ігнараваць гэта — значыць, упадаць у вульгарызатарства. Але тое, што вядома ўжо вучню сярэдняй школы, выходзіць з-пад увагі маладога літаратуразнаўцы. Яму не да гэткіх «драбніц». Яго цікавіць пытанне куды больш маштабнае — як вынайсці эфектыўныя рэцэпты, дзякуючы якім пісьменнікі змаглі б вызваліцца ад «путаў традыцыйнасці», выпрацаваць новы «аналітычны» стыль сучаснасці.

І тут аўтар з вынаходлівасцю, вартай цыркавога жанглёра, выцягвае адну за другой праблемы, вырашэнне якіх, на яго думку, павінна вызначыць лёс літаратуры. Што гэта за праблемы? — Па-першае, вельмі востра стаіць перад беларускімі пісьменнікамі «праблема прыніжанасці і нават часам мізэрнасці інтэлекту герояў...».

Міжволі прыйдзеш у недаўменне: адкуль гэта — з крытычнага артыкула ці з літаратурнай пародыі? Няўжо аўтар сур'ёзна думае, што рэальна існуе такая праблема? Няўжо ён не заўважае, мякка кажучы, усю недарэчнасць свайго сцвярджэння?

Далей, зазначае крытык, «асабліва важна, каб ва ўсіх нашых творах прагучала праблема праблем — яе вялікасць Праўда жыцця...»

Але каму невядома, што жыццёвая праўда была заўсёдным клопатам рэалістычнага мастацтва? Уся ж справа ў тым, што ўкладаць у гэтае паняцце. І калі б Яскевіч, зыходзячы з прынцыпаў марксісцка-ленінскай эстэтыкі, дапамог нам высветліць сутнасць праўды мастацкага абагульнення ў яе непарыўнай сувязі з ідэйнай пазіцыяй пісьменніка, мы былі б толькі ўдзячны даследчыку. Але гэта не ўваходзіць у намеры крытыка. Лагічную аргументаванасць у яго заміняе метафарычная квяцістасць. Так, надаўшы праўдзе жыцця ранг каралеўскай «вялікасці», а талент пісьменніка параўнаўшы з капрызнай «каханкай», аўтар лічыць, што ён тым самым вычарпаў сутнасць праблемы.

Аднак больш за ўсё ўвагі ў артыкуле аддадзена «тэндэнцыі развіцця моўна-стылявых традыцый у літаратуры», у чым Яскевіч бачыць ключ для вырашэння ўсіх важнейшых задач нашай літаратуры.

Слушна заўважыўшы, што ў выніку гістарычных умоў у беларускай мове «аказаўся моцна развіты адзін лексічны пласт — сялянска-бытавы», крытык тут жа патапляе гэтае назіранне ў слоўнай паводцы:

«Працэсы канкрэтызацыі слова, адбор лексікі, адпаведнай індывідуальнай сялянскай псіхалогіі, а таксама фанетычныя асаблівасці нашай мовы вельмі ўзмацнілі эпічны бок нашага слова, надалі яму **канкрэтнасць** і важкасць» (падкрэслена намі).

Вось яна, навуковая зоркасць даследчыка: «працэсы канкрэтызацыі» надалі «канкрэтнасць»! Сапраўды, атрымліваецца масла масленае...

Выявіўшы стылявую «беднасць» нашай мовы, Яскевіч выступае за ўзбагачэнне яе лексікі, без чаго яна нібыта не можа свабодна перадаваць абстрактна-разумовыя паняцці. Што ж прапаноўвае крытык? Неабходна, вучыць ён, пранікаць у «сакрэты паэтычнага свячэння лексікі». Для аўтара ў дадзеным выпадку ніякага значэння не мае сэнсавае напаўненне слова. Ці трэба даводзіць, што кожнае новае слова ўзнікае з жыццёвай неабходнасці перадаць тую ці іншую з'яву, прадмет, паняцце, якія нараджаюцца ў рэчаіснасці? Але якраз у сувязі з гэтым крытык і «ўпікае» наш друк, які нібыта «засмечвае» мову ўвядзеннем новых слоў, не ўлічваючы іх «свячэння». Што ж разумее пад гэтым таямнічым «свячэннем лексікі» сам аўтар? Вось яго тлумачэнне:

«Пры вымаўленні ці прачытанні слова адбываецца працэс нібыта набліжэння гукавога комплексу слова да замацаванага за ім сэнсу». Ці ж не адкрыццё гэта? Слова і замацаваны за ім сэнс, аказваецца, існуюць паасобку, і толькі ў пэўныя моманты яны «нібыта набліжаюцца»! Вось над чым павінны ламаць галаву майстры літаратуры, калі яны хочуць адкрыць «сакрэты паэтычнага свячэння лексікі...»

Прасвятліўшы пражэктарам сваёй неўтаймаванай фантазіі ўсе гэтыя «праблемы», Яскевіч падыходзіць да аднаго з галоўных вывадаў артыкула:

«Задача заключаецца цяпер не ў тым, каб слепа трымацца добра зляжалых традыцый, а смела рыхліць традыцыйную моўную глебу пад пасевы будучай літаратуры». Прасцей і дакладней гэты заклік можна было б выказаць так: «Далоў народную мову! Знішчайце яе скарбы! Стварайце новую мову на прынцыпах «паэтычнага свячэння!»

Цяжка вызначыць, што тут пераважае, — анархізм «раскаванага мыслення» ці звычайная філалагічная непісьменнасць.

Не прамінае крытык магчымасці праліць святло і на іншыя праблемы мастацкай творчасці... Вядома ж, не магло выпасці з-пад яго ўвагі такое «моднае» пытанне, як мастацкі падтэкст. Гэтае паняцце для крытыка ўяўляецца нейкім усепаглынаючым сховішчам, куды апускаюцца «экспазіцыі, адступленні, перадгісторыі, неэканомныя сюжэтныя «масткі» і інш.» Калі ўлічыць, што нешта яшчэ маецца на ўвазе пад гэтым «і інш.», дык натуральна запытацца, што крытык пакідае для самога тэксту?

Але, відаць, кульмінацыі вынаходніцкая думка даследчыка дасягае там, дзе ён спрабуе акрэсліць асноўныя асаблівасці «сучаснага аналітычнага стылю»:

«Проза «ўспыхваючых» асацыяцый дазваляе вобразнаму мысленню свабодна кружыць у далячынях чалавечай фантазіі і складанага інтэлекту сучасніка, рабіць няўлоўныя пераходы ад рэальных да настраёвых планаў».

Калі ўсю гэтую слоўную эквілібрыстыку перавесці на зразумелую мову, дык сэнс яе можна было б выказаць вельмі коратка: пішыце, што каму ўздумаецца, што ў галаву ўзбрыдзе!

Ці не ў гэтым бачыць крытык тую «раскаванасць мыслення», за якую ён так заўзята выступае?

Каб давесці рэальнасць адкрытай ім прозы «ўспыхваючых» асацыяцый, Яскевіч спасылаецца на канкрэтныя прыклады з беларускай літаратуры. Якія ж творы ўдастоены гонару быць залічанымі да гэтай прозы? Гэта апавяданні Янкі Брыля «Надпіс на зрубе», Івана Навуменкі «Дом над морам» і «Раман з эпілогам», Міхася Стральцова «Перад дарогай» і «Блакітны вецер», аповесці Васіля Быкава «Жураўліны крык» і «Трэцяя ракета» ды «некаторыя спробы» Уладзіміра Караткевіча. Але разумеючы, што назваць — гэта яшчэ не значыць даказаць, А. Яскевіч вырашыў усё ж падмацаваць сваё «адкрыццё» цытатай з апавядання І. Навуменкі «Раман з эпілогам». Вось яна:

«Я чакаю Міну. Над полем, лесам, вёскаю ўрачыстае зорнае неба. Яно заўсёды супакойвае. Перад тварам яго бязмежнай велічы з думак і пачуццяў знікае ўсё дробязнае, недарэчнае, усё, што можна забыць праз дзень або праз год. Нячутна ўпала, апісаўшы срэбную дугу, знічка. Высока, пад самымі зоркамі, праляцеў самалёт — рухомая чалавечая зорка. Паволі навісае туман, расцякаецца парнасць. Галасы і зыкі ў вёсцы сціхаюць. Я задрамаў.

... Вечар патушыў усе колеры, застаўся толькі адзін — шэры. У гэтым шэрым — бляск агню, срэбнае мігценне зорак, таямнічае загадкавае святло месяца. Ці не напамінак гэта, што пасля ночы прыйдзе дзень?.. Зоркі льюць святло. Калі льюць, то павінен быць гук. Можа хто-небудзь у будучым перакладзе на музыку ззянне зорак і тады чалавек пачуе дзівосную сімфонію».

Што можа ўбачыць у гэтым урыўку вока звычайнага чытача, не ўзброенага лінзамі мудрагелістых формул? Лірычную пейзажную замалёўку, вытрыманую ў добрых традыцыях коласаўскай прозы. Але вось што адкрывае ў гэтым крытычная празарлівасць даследчыка:

«Ад сутыкнення сумежных вобразаў, на грані змешвання паняццяў успыхваюць, прабягаючы па фразе, сполахі асацыяцый».

Каментары, здаецца, лішнія. Можна толькі сказаць, што, спрабуючы прасачыць гэтыя канвульсійныя ўсплёскі думкі, увачавідкі пераконваешся, як часта малады крытык у сваіх разважаннях сапраўды стаіць на «грані змешвання паняццяў».

У адным з абзацаў свайго артыкула А. Яскевіч з'едліва высмейвае тых, для каго на свеце «ўсё ясна і празрыста». Як відаць, сам крытык прытрымліваецца дыяметральна-супрацьлеглых прынцыпаў — затуманьваць яснае і заблытваць зразумелае.

Артыкул «Традыцыйнае і наватарскае» змешчаны пад рубрыкай «Размовы аб майстэрстве», якая мае на мэце знаёміць чытача з творчай лабараторыяй слова, дапамагчы яму пазнаць законы мастацкай творчасці, выхаваць добрыя эстэтычныя густы. Але чаму можа навучыць гэты артыкул? Ён можа толькі дазарыентаваць тых, хто хоча разабрацца ў надзённых праблемах развіцця сучаснай беларускай літаратуры.

ПРЭМ'ЕРА Ў КУПАЛАЎЦАЎ

Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паставіў спектакль «Футбол» па п'есе прагрэсіўных драматургаў—француза П. Кантэна і амерыканца Дж. Белак. Рэжысёр пастаноўкі Л. Відаўскі, мастацкае афармленне А. Грыгар'янца.

У спектаклі заняты артысты Л. Рахленка, П. Іваноў, С. Станюта, А. Мілаванаў, Ю. Шумакоў, Г. Аўсянікаў, В. Тарасаў, А. Казачок, С. Хацкевіч, Л. Федароўская і іншыя.

На здымках: уверсе—Пол Мелвіл — артыст Л. Рахленка; унізе — Стэнлі Кара — артыст В. Тарасаў, Сэндзі Рэмінгтон — артыст Г. Аўсянікаў.

Фота Ул. КРУКА.

ШКОЛА ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ

Матэматыкам не расказваюць тут аб мудрагелістых формулах, фізікам — аб фізічных законах прыроды... У аўдыторыі ідзе гаворка пра мастацтва, сцэнічнае майстэрства, пра сістэму Станіслаўскага. Размову вядзе акцёр Тэатра юнага гледача П. Гуд. Сорак вачэй з цікавасцю сочаць за кожным рухам і мімікай выкладчыка, стараюцца не прапусціць ніводнага слова. І толькі тады, калі лекцыя закончана, аўдыторыя адразу ажыўляецца: сыплюцца пытанні...

Гэта ідуць заняткі ў школе грамадскіх прафесій, якая створана ў Мінскім педінстытуце імя М. Горкага. Школа зацікавіла многіх студэнтаў. На занятках гуртка аддаецца ўвага не толькі тэорыі, але і практыцы. У інстытуце створана драматычная студыя «Семафор», студэнты развучваюць сатырычныя і гумарыстычныя сцэнкі, знаёмяцца з народнай і эстраднай музыкай.

Гэта — сапраўдны самадзейны тэатр мініяцюр. Два—тры разы ў месяц студыйцы выязджаюць з канцэртамі ў калгасы і саўгасы Мінскай вобласці, памагаюць наладзіць работу гурткоў мастацкай самадзейнасці сваім падшэфным прадпрыемствам. Некалькі разоў яны былі, напрыклад, у калгасах імя Фрунзе, Чапаева і іншых.

Студэнтка трэцяга курса факультэта пачатковых класаў педінстытута імя М. Горкага ўспамінае, як яна ў 1958 г. закончыла педвучылішча. Накіравалі дзяўчыну працаваць у далёкую вёску былога Смалявіцкага раёна. Маладой настаўніцы даручылі арганізаваць мастацкую самадзейнасць у калгасе. Вось тады і давялося адчуць горыч свайго няўмення, незадаволенасць набытымі ведамі і сорам перад калгаснай моладдзю. Яна не ўмела ні кіраваць гуртком, ні прачытаць лекцыі, ні зрабіць нават самы маленькі даклад...

Цяпер Соф'я Рудакоўская студэнтка педінстытута. Ахвотна займаецца яна ў школе грамадскіх прафесій. Дзяўчына любіць спевы і музыку. І яна наведвае двухгадовую школу, дзе можна набыць патрэбныя ёй веды ў выкладчыкаў П. Грыгорчанкі, І. Сак, загадчыка кафедры музыкі П. Ахраменкі. У школе спеваў і музыкі студэнтаў вучаць нотнай грамаце, вучаць валодаць адным якім-небудзь музычным інструментам, скажам, баянам, домрай і інш. А для цікаўных створаны аддзяленні народных інструментаў, баяна, эстрадны і духавы аркестры. Займаецца тут звыш 100 студэнтаў. Душою ўсёй гэтай справы з'яўляецца выкладчык Ул. Перацяцька.

На першым часе рознае можна было пачуць ад студэнтаў.

— І так вучэбная нагрузка вялікая... а тут яшчэ надумалі рабіць з нас нейкіх музыкантаў,— гаварылі некаторыя скептыкі.

Толькі Уладзімір Сяргеевіч не адступаў. Ён адшукаў тых студэнтаў, якія крыху разумелі музыку, і пачаў з імі займацца. Першымі яго вучнямі былі Радзіслаў Букенгольц, Аляксей Грынфільд, Барыс Гапановіч і Валянцін Мінін. Хлопцы дапытлівыя, старанныя. Вучыліся самі і ўцягвалі ў гурток другіх. І хутка студэнцкі эстрадны пачаў гучаць па-сапраўднаму, і ахвотнікаў займацца ў ім значна прыбавілася.

Праз год адбудзецца першы выпуск школы грамадскіх прафесій, якая разлічана на два гады навучання. Пасведчанні кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці атрымаюць 12 слухачоў духавога аркестра, 15 —эстраднага, 60—харавога, 50 — драматычнага гуртка, 28—танцавальнага, 20—аркестра народных інструментаў, 16 баяністаў.

А цяпер на хвіліну пераносімся ў вёску, куды паедуць працаваць маладыя настаўнікі. Як будуць узрадаваны сельскія жыхары, калі даведаюцца, што кожны малады спецыяліст прывёз да іх яшчэ і другі дыплом: у інстытуце іх навучылі граць на баяне, кіраваць танцавальным, харавым, драматычным, музычным гурткамі... Сапраўдны скарб для вёскі такія людзі, і іх рыхтуюць цяпер у Мінскім педагагічным інстытуце!

Школа грамадскіх прафесій аб'ядноўвае больш дзесяці гурткоў розных профіляў, і ўсе яны патрэбны на вёсцы. Тут і фота (кіруе ім студэнт Рыгор Ермашкевіч), і аўта-мота (кіраўнік былы аўтатэхнік, студэнт Мікалай Сянкевіч), і кінагурток, якім кіруе выкладчыца З. Папова, і спартыўная секцыя, якая рыхтуе грамадскіх інструктараў фізкультуры (кіраўнік выкладчык Я. Маркаў), і танцавальны гурток (кіруе В. Струлёў), і школа лектараў і дакладчыкаў пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры М. Талкачова.

Будучыя лектары вывучаюць майстэрства чытання лекцый, вучацца рыхтаваць і збіраць матэрыялы для публічнага выступлення. Студэнты ўжо цяпер спрабуюць свае сілы: яны чытаюць лекцыі на многіх прадпрыемствах Мінска, у калгасах. Кожны раз, калі яны едуць на канікулы, абавязкова атрымліваюць заданне прачытаць некалькі лекцый у родным калгасе, саўгасе, горадзе. Студэнты Яўгенія Шкуратава, Уладзімір Шарай, Леў Ляпіч, Генадзь Івашнёў і іншыя з задавальненнем бяруцца за гэтыя даручэнні.

Так што, як бачна, школа грамадскіх прафесій карыстаецца ў інстытуце шырокай папулярнасцю. Дзеля каардынацыі дзейнасці яе шматлікіх гурткоў створаны нават факультэт грамадскіх прафесій, дэканам якога з'яўляецца выкладчык І. Дрозд. І партком, і камітэт камсамола, і прафком па-сур'ёзнаму цікавяцца работай гэтай школы. І справа цяпер у інстытуце наладжана так, што кожны студэнт можа выбраць сабе па душы другую грамадскую прафесію. Студэнты Наталля Пырсянкова, Ларыса Лаханская, Міхал Буй, Валянціна Ісаенка, Ганна Сарокіна, Іра Харашчо займаюцца адразу ў двух-трох гуртках. А ўсяго школу грамадскіх прафесій наведвае 525 студэнтаў.

Праўда, хацелася б, каб гэтая лічба значна павялічылася. У педінстытуце ж вучыцца больш 1600 студэнтаў, і няхай кожны будучы настаўнік абавязкова набудзе яшчэ і другую прафесію — грамадскую!

Варта зрабіць яшчэ адну заўвагу: трэба, каб у школе грамадскіх прафесій сярод іншых быў і бібліятэчны гурток. Студэнты старэйшых курсаў бібліятэчнага факультэта з поспехам маглі б вучыць сваіх таварышаў бібліятэчнай справе, якая таксама ў жыцці можа спатрэбіцца.

Вопыт Мінскага педінстытута заслугоўвае пахвалы і пашырэння.

А. ЧАРНОЎ,
М. УЛАДЗІМІРАЎ.

Выйшлі з друку

У Дзяржаўным выдавецтве Беларусі выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі мастацкай літаратуры:

Мікола Аўрамчык. Сустрэча былых канагонаў. Вершы. Мастак Л. Чурко. Тыраж 3 тыс. экз., стар. 80. Цана 9 кап.

Антон Бялевіч. Залатыя ключы. Вершы і фельетоны. Мастак Г. Клікушын. Тыраж 2 700 экз., стар. 192. Цана 34 кап.

Уладзімір Дадзіёмаў. Белазёрскі дзённік. Мастак І. Немагай. Тыраж 5 600 экз., стар. 216. Цана 33 кап.

Міхась Запескі. Скакалачка. Апавяданні. Для дашкольнага і малодшага ўзросту. Малюнкі К. Ціхановіча. Тыраж 20 тыс. экз., стар. 36. Цана 4 кап.

Пад коранъ. Зборнік сатыры і гумару. Мастак Б. Забораў. Тыраж 6 000 экз., стар. 248. Цана 41 кап.

Марыя Казлоўская. Шчасце побач з табою. Аповесць. Мастак С. Русак. Тыраж 10 тыс. экз., стар. 168. Цана 17 кап.

Еўдакія Лось. Людзі добрыя. Вершы. Мастак І. Немагай. Тыраж 2 600 экз., стар. 136. Цана 19 кап.

Васіль Макарэвіч. Вогненная камета. Вершы. Мастак Б. Аракчэеў. Тыраж 2 тыс. экз., стар. 48. Цана 9 кап.

Алесь Махнач. Шпачок. П'есы і сцэнкі для школьнай мастацкай самадзейнасці. Для сярэдняга ўзросту. Мастак Л. Замах. Тыраж 7 тыс. экз., стар. 120. Цана 14 кап.

Добрая дружба ўстанавілася паміж рабочымі гомельскага завода «Электраапаратура» і старшакласнікамі 23-й школы горада. Рабочыя прадпрыемства дапамаглі арганізаваць у школе вытворчае навучанне, вучаць школьнікаў ў цэхах працаваць на станках.

Многім юнакам і дзяўчатам прыйшлася да спадобы складаная тэхніка. Яны з захапленнем вывучаюць яе і, напэўна, з часам будуць працаваць на гэтым прадпрыемстве пасля заканчэння школы.

Вучні часта выступаюць перад сваімі шэфамі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці.

Нядаўна ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці школы далі ў цэху канцэрт. Поспехамі школьнікаў у вучобе зацікавілася брыгадзір Тамара Лобзікава. Пасля канцэрта завязалася сяброўская гутарка.

Фота Ч. МЕЗІНА. (БЕЛТА).

Макар ПАСЛЯДОВІЧ

Як расталася наша суполка

ЛІТАРАТУРНЫ ПАМФЛЕТ

Каб у мяне хто запытаўся, чаму я пачаў пісаць раман разам з Віктарам Сцяпанавічам, я, відаць, і сёння не даў бы яснага тлумачэння. Таксама, як мне здаецца, нічога б не растлумачыў і сам Віктар Сцяпанавіч. Тым больш, што ён гарачы прыхільнік творчых таямніц, да якіх не падпускаў на гарматны стрэл нават сваю ўласную жонку.

Пакуль ён чытаў Талстога і Шолахава, галоўныя героі яго твораў заўсёды выходзілі пераможцамі, партыйныя і савецкія работнікі часта дапамагалі ім у іх зацятай барацьбе з усялякімі прайдзісветамі і хапугамі. Крытыка прыхільна сустракала апавяданні Віктара Сцяпанавіча, сцвярджаючы, што ён плённа вучыцца ў нашых лепшых майстроў слова. Вядома, пісалі рэцэнзенты, ёсць у творах і пэўныя недахопы, але, трэба спадзявацца, яны будуць улічаны і выпраўлены аўтарам пры чарговым выданні сваіх твораў.

Потым Віктар Сцяпанавіч пачаў чытаць Хэмінгуэя і Рэмарка, якіх яму нараіў тады яшчэ малады і малавядомы філолаг Адам Стронга. І ад гэтага часу галоўныя героі Віктара Сцяпанавіча пачалі ныць, шукаць нейкіх прыгод, расхрыстваць душы нават там, дзе і не патрэбна. Пачуліся ўстрывожаныя галасы крытыкаў: што сталася з Віктарам Сцяпанавічам, дзе ў яго падзелася праўда жыцця?

І тады ўпершыню падаў свой голас Адам Стронга:

— Праўда жыцця ў падтэксце! Толькі лакіроўшчыкі разжоўваюць усё. Віктар Сцяпанавіч — вялікі наватар! Чараўнік слова!

Некалькі шустрых навуковых супрацоўнікаў інстытута Літаратурнага ляманту і крыку, начытаўшыся гэтага падтэксту, рынуліся ў цырульні перастрыгацца на заходні манер, каб неадкладна засесці за кандыдацкія і доктарскія дысертацыі пра вялікага наватара. Адзін з іх, вывучаючы дашкольную літаратурную дзейнасць Віктара Сцяпанавіча, знайшоў, што слова «мама» мела ў яго зусім іншы змест, чым, скажам, некалі ў Пушкіна ці ў Талстога.

«У далейшых даследаваннях, — абяцаў дысертант, — мы прасочым, як прымітыўна і спрошчана трактавалася «мама» некаторымі лакіроўшчыкамі ў трыццатыя і саракавыя гады. Адзін толькі Віктар Сцяпанавіч самаахвярна пранёс «маму» праз цяжкія часы культу асобы, не зважаючы на свой вучнёўскі узрост. Трэба сказаць, што багатым, самабытнейшым падтэкстам вызначаецца ў яго І слова «тата». Яно ў яго гучыць па-новаму, гучыць смела!»

Першаадкрывальнікам новага празаічнага таленту і новай плыні ў літаратуры, аднак, лічыўся Адам Стронга. Пакуль старэйшыя літаратуразнаўцы разбіраліся, што да чаго, ён скасаваў многіх раманістаў за іх кансерватыўную класічную манеру пісьма па арыгінальнай і свежай формуле: «Калі няма падтэксту, дык няма і тэксту!» Неўзабаве ў кнігарнях з'явілася грунтоўнае даследаванне Адама Стронгі «Праўда жыцця — у падтэксце», напісанае на аснове творчасці Віктара Сцяпанавіча. Гэта была кандыдацкая дысертацыя маладога літаратуразнаўцы. А яшчэ праз два гады Адам Стронга атрымаў годнасць доктара філалагічных навук за новую навуковую працу «У падтэксце — праўда жыцця».

Мастакі пачалі маляваць маслянымі фарбамі партрэты Віктара Сцяпанавіча. Скульптары спешна замешвалі гліну і гіпс на яго бюсты, нават падалі заяўку ў аддзел фондавых матэрыялаў адпусціць ім бронзу.

Прызнацца па шчырасці, мяне і многіх маіх таварышаў вельмі здзіўляла незвычайная мітусня Стронгі і яго напорнай чародкі вакол Віктара Сцяпанавіча. Не паспяваў малады празаік раззявіць рот, як модныя літаратуразнаўцы ўжо крычалі на ўсё наваколле:

— Ах, як гэта трапна! Як геніяльна! Такое можа сказаць толькі вялікі майстар слова!

Адна літаратурная дама, сэкзальтаваная ўсемагутным таямнічым падтэкстам апавяданняў Віктара Сцяпанавіча, таксама залемантавала ў даволі напоўненай зале: «Ах, які ён мастак! Які ён мастак!» і адразу знепрытомнела. Давялося выклікаць хуткую дапамогу і весці небараку ў бальніцу...

Так, дзякуючы Стронгу і яго маладым хаўруснікам з моднымі заходнееўрапейскімі прычоскамі, Віктар Сцяпанавіч зрабіўся літаратурным святілам. Тэрмінова быў падрыхтаваны і выдадзены акадэмічны аднатомны поўны збор яго твораў, палову якога займала прадмова маладога доктара філалагічных навук. Асабліва высока былі ацэнены ў прадмове школьныя дзённікі Віцькі, як па-простаму называўся славутым літаратуразнаўцам Віктар Сцяпанавіч!

«Паміж двоек, троек, пяцёрак будучага пісьменніка, — сцвярджаў Стронга, — ужо тады адчуваўся багаты падтэкст. І не заўважыць яго ў змешчаных тут дзённіках можа толькі той, у каго і кроплі няма мастацкага густу. Але такі ўжо лёс мастакоў-наватараў! Часам ім даводзіцца выслухоўваць дакоры, што замест стройнай кампазіцыі карціны глядач бачыць адны бязладныя і стракатыя плямы фарбаў. Мы павінны папярэдзіць, што ў сучасным мастацтве ўжо не трэба раскрываючы характар чалавека, маляваць яго з нагамі, тулавам, галавою. Досыць паказаць адасоблена любую частку цела альбо, скажам, крысо пінжака, каб ты ўбачыў натхнёны і паўнакроўны вобраз сучасніка магутнага атамнага веку. Можа, калі мераць састарэлым класічным аршынам, многія вобразы герояў Віктара Сцяпанавіча будуць выглядаць голымі альбо нават безгаловымі, не бянтэжся, дарагі чытач! У адменных ідэй і свае адменныя формы».

Прагрэсіўныя прычоскі падхапілі гэты прагрэсіўны тэзіс і з патроенай сілай залемантавалі пра кансерватыўныя элементы, якія перашкаджаюць плённым пошукам маладых наватараў. Прыводзіліся жахлівыя факты, калі, напрыклад, адзін літаратурны кансультант запатрабаваў ад пачынаючага генія апрача загалоўка і аўтарскага подпісу даць яшчэ і тэкст апавядання. Тэрмінова быў склікан вучоны савет інстытута Літаратурнага ляманту і крыку. На гэтым савеце прагрэсіўныя прычоскі садзіліся, як засёўды, асобна ад кансерватыўных прычосак і натхнёнымі воклічамі і воплескамі падтрымлівалі ўсіх тых, хто выступаў з ультраарыгінальнымі ідэямі ў галіне формы. Пасівелыя філолагі са сваімі традыцыйнымі прычоскамі толькі збянтэжана пацісканалі плячыма, успамінаючы ў думках даўно забытыя лахманы футурызму і ўедлівую іржу групаўшчыны. Паспрабуй, аднак, запярэчыць, што Адам Стронга спрытна выдае старыя дзіравыя галёшы за новы і дабраякасны тавар, дык адразу ўсё закіпіць у шчыльнай наватарскай чародцы: «Кансерватараў і лакіроўшчыкаў на мыла!»

Некаторыя пасівелыя філолагі так спалохаліся гэтых літаратурных мылавараў, што пачалі ім патурацъ: «Нічога, хлопчыкі, калі што якое, дык прагрэсіўныя сілы абароняць вас ад дагматыкаў. Націскайце так і далей! Прэч эпіку! Дарогу лірычным героям!»

Віктар Сцяпанавіч, зразумела, быў першай скрыпкай у групе модных літаратурных прычосак.

— Адам учора вярнуўся з Парыжа, — паведамляў ён нібы між іншым. — Гаворыць, што на Захадзе раману, кажучы па-просту, надышла хана. А ў нас друкуюць старажытныя дылогіі, трылогіі, тэтралогіі... І ў іх не Я герой, а Ён герой. Вельмі мы ўжо саромеемся свайго Я ў творах!

Прагрэсіўныя прычоскі ваяўніча азіраліся навакол, каб паглядзець, ці не прамінулі яны якінебудзь твор, дзе яшчэ дыхае пасля іх спусташальных крыжовых паходаў эпічны герой.

Ад усяго гэтага ляманту Віктар Сцяпанавіч стаў нібы загаварвацца. Не-не, ды пальне такое, што не лезла ні ў якія вароты. Асабліва шмат нядобрага валіў ён на сваё роднае паселішча: яно і глухое і бруднае, і раскашуюцца ў ім хіба адны гультаі і прайдзісветы. Паслухаць Віктара Сцяпанавіча, дык нам хлеб і малачко з неба падаюць.

— Паслухай, — сказаў я яму аднойчы, — праедзем у калгас. Я табе пакажу людзей, якіх, мне здаецца, ты яшчэ не бачыў. Сапраўдныя пераўтваральнікі.

— У вёску я езджу больш, чым ты, — буркнуў Віктар Сцяпанавіч. — Вось і ўчора толькі вярнуўся.

— Ты ездзіў на рыбалку!

— А рыбалка, па-твойму, дзе: на плошчы Якуба Коласа ці каля кінатэатра «Мір»?

Што ты будзеш казаць! Ходзіць чалавек паўгода, год, а работы не відаць. Неяк пацягнуў яго на завод, дзе ў мяне шмат знаёмых рабочых і інжынераў. Бачу, яму нібы спадабалася. Чалавек нібы аджыў, павесялеў. На другі дзень паехаў

(Заканчэнне на 4-й стар.)

Нашы госці

УСЁ—АД СЭРЦА

Рознакаляровыя спадніцы, на беласнежных рукавах — чырвоныя палосы арнаменту, атласны бляск шаравараў — уся сцэна квітнее багаццем фарбаў нацыянальных касцюмаў. Наперад выходзіць высокая, прыгожая, чарнавокая дзяўчына і яе звонкі голас гучыць пад скляпеннямі залы: «Мы з Украіны!»

«Мы з Украіны» — так называецца яркая харэаграфічная кампазіцыя, якой пачаў свае гастролі ў Мінску Дзяржаўны заслужаны ансамбль танца Украінскай ССР. Першы нумар нібы «задае тон» усяму канцэрту, уводзіць нас у атмасферу свята, радасці і вялікай шчырасці. Шчырасць, непасрэднасць выканання з'яўляюцца, бадай, адной з самых характэрных і прывабных рысаў гэтага таленавітага калектыву. У яго рэпертуары няма ніводнага танца, выкананага ў «падбадзёрваючым» стылі, які паспеў ужо надакучыць, тут не ўбачыш ніводнай усмешкі, пасланай у залу аўтаматычна. Усё — ад сэрца, усё сагрэта вялікай цеплынёй чалавечага пачуцця і таму выклікае жывы водгук у гледачоў.

Яшчэ адна вартасць выканаўчага майстэрства калектыву — незвычайная выразнасць кожнага яго ўдзельніка. У ансамблі ёсць і выпускнікі харэаграфічных вучылішчаў, і людзі, якія прыйшлі з мастацкай самадзейнасці, і маладыя артысты, і вопытныя «ветэраны» — усе яны не толькі цудоўныя танцоры, але яшчэ і добрыя драматычныя акцёры. Кожны іх рух апраўданы, сэнс дзеяння ясны і даходлівы. Артысты праяўляюць глыбокае разуменне нацыянальнага характару і кожны з іх, нягледзячы на тое, што ў масавых танцах дакладна паўтарае рухі іншых («станцаванасць» артыстаў, апрацаванасць і сінхроннасць рухаў проста здзіўляючыя), — кожны ўмее знайсці нейкія свае рысачкі, стварыць свой закончаны тыпаж. Колькі, напрыклад, розных характараў з'яўляецца перад гледачамі ў «Вясельным танцы» або асабліва ў «Чумарачцы».

Віртуознасць танца — яшчэ адна асаблівасць украінскіх артыстаў. Выкананне кожнага руху даведзена да бляску. Імклівыя кручэнні, галавакружальныя скачкі не магчыма пералічыць, цяжка нават запомніць усіх тых, хто здзіўляў сваім тэхнічным майстэрствам. Пасля першага аддзялення канцэрта здавалася, што ўсе салісты ўжо знаёмы, што лепшых танцораў мы ўсіх ужо ведаем. Але таленты ансамбля аказаліся невычэрпнымі, паўляліся ўсё новыя і новыя бліскучыя выканаўцы, і пад канец вечара стварылася ўражанне, што ўсе сто дзесяць артыстаў танцуюць аднолькава добра і што кожны з іх можа выконваць самыя складаныя тэхнічныя трукі.

Вялікая заслуга ў стварэнні калектыву з такім яркім творчым абліччам належыць мастацкаму кіраўніку і балетмайстру ансамбля народнаму артысту СССР Паўлу Вірскаму, які працуе ў калектыве шмат гадоў. Ён паказаў сябе як разумны, чулы кіраўнік і таленавіты пастаноўшчык. Усе танцы праграмы, паказанай ансамблем у Мінску, пастаўлены П. Вірскім. У іх ярка праявіліся багатая фантазія і невычэрпная вынаходлівасць балетмайстра. Малюнак яго танцаў заўсёды разнастайны, ён віецца як маляўнічы мудрагелісты ўзор «Рукадзельніц», — аднаго з самых цудоўных танцаў праграмы.

Для большасці нумароў, створаных Вірскім, характэрна сюжэтнасць. Амаль кожны танец сродкамі ўласцівай яму вобразнай пластыкі расказвае пра нейкую канкрэтную падзею або з гісторыі («Чырвоная каліна», «Запарожцы»), або з жыцця сённяшняй Украіны («На кукурузным полі», «Маракі флатыліі «Савецкая Украіна»).

Адчуваецца цудоўнае веданне аўтарам танцавальнага фальклору і вялікая любоў да яго. Ва ўсіх танцах шырока выкарыстаны матывы народнай творчасці, у іх ажываюць быт украінцаў, іх легенды і звычаі, раскрываецца жывая душа народа. І кожны раз даводзіцца нанава здзіўляцца багаццю і невычэрпнасці фарбаў народнай творчасці, вечнай яе маладосці і нявянучай прыгажосці.

Творчасці балетмайстра ў вялікай меры ўласцівы гумар. Ім прасякнуты ўсе танцы і сцэнкі. Асабліва ўдалымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца танцы казацкі «Паўзунец», «На кукурузным полі» і «Чумацкія радасці». Апошні — гэта харэаграфічная карцінка з далёкай мінуўшчыны ўкраінскага народа. Ні жабрацтва, ні бяспраўе не маглі знішчыць прыроднай жыццярадаснасці ўкраінцаў, іх гумару і дабрадушнасці.

...Высокія лакіраваныя боты, якія па нейкаму шчасліваму выпадку дасталіся чатыром хлопцам, становяцца для іх цэлай падзеяй, святам, пра якое можна будзе потым доўга ўспамінаць і расказваць. Заканчваецца гэтая гісторыя драматычна: боты не вытрымліваюць заліхвацкага танца, і ад іх адвальваюцца падэшвы. Гумар гэтай сцэны шчодры, па-ўкраінску мяккі і сакавіты.

У гэтым танцы, як і ў многіх іншых, праявілася не толькі балетмайстарскае, але і значнае рэжысёрскае майстэрства П. Вірскага. Ён умела будуе мізансцэны, перамяжоўвае танец гуллівымі кавалкамі, дасціпна абыгрывае дэталі. Добра гучаць у аркестры ўкраінскія мелодыі (дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтва УССР І. Івашчанка), маляўнічы, з густам вырашаны касцюмы (народны мастак СССР А. Пятрыцкі).

Калектыў ансамбля пабываў на гастролях у многіх краінах свету. І гледзячы на жыццярадаснае, захапляючае мастацтва ўкраінскіх артыстаў, разумееш, чаму такі вялікі поспех суправаджае ўсюды іх выступленні. Яны нясуць людзям многа радасці і эстэтычнай асалоды, нясуць мастацтва вялікай жыццёвай праўды і высокай паэзіі пачуццяў.

Юлія ЧУРКО.

Танец «Рукадзельніцы» ў выкананні заслужанага ансамбля танца УССР. Фота Ул. КРУКА.

ЧАЛАВЕК СВЕТЛАЙ ДУШЫ

Удзень у гэтым доме на ўскраіне Мелехавіч тоўпяцца дзеці. А ледзь сцямнее, сюды грамадою ці па аднаму ідуць калгаснікі. Адны прыходзяць памяняць кнігу, другія — проста так, пасядзець, пагутарыць з гаспадыняй, грамадскім бібліятэкарам Надзеяй Васільеўнай Шапшук. Мо і не думала ніколі пажылая калгасніца, што давядзецца пад старасць загадваць бібліятэкай, а вось, глядзі ты, загадвае. А справа была так. Сын Алёшка дужа ўжо любіў кнігу. Скончыў школу і папрасіў у аддзеле культуры паслаць яго ў вёску бібліятэкарам. Накіравалі хлопца ў Куляны, за два кіламетры ад Мелехавіч. Далекавата было яго аднавяскоўцам хадзіць за кнігай, вось ён і адкрыў у сваёй хаце філіял бібліятэкі. І неяк само сабой атрымалася, што выдаваць чытачам кнігі часцей даводзілася маці: сын то на рабоце затрымаецца, то яшчэ дзе-небудзь.

Ішоў час. Аляксандра прызвалі на службу ў Савецкую Армію. На рабоце яго замяніў другі чалавек. А з хатняй бібліятэкай Надзея Васільеўна не захацела расставацца:

— Ну, як жа мне без яе? Дзеткі малыя прыходзяць, школьнікі. Куды ж ім ісці, аж у Куляны? Ды і дарослыя прывыклі ўжо, што ў вёсцы ёсць бібліятэка...

З тае пары пайшоў трэці год. Цяпер у бібліятэцы больш 150 чытачоў. Ну, а кніг, зразумела, значна больш. Кожны месяц, а калі час ёсць, то і два разы, мяняе іх Надзея Васільеўна ў раённай бібліятэцы. Прытым стараецца кожнаму знайсці кнігу па душы. Вось, напрыклад, Мікалай Месячык захапляецца садаводствам, і бібліятэкарка прывозіць яму кнігі пра тое, як гадаваць пладовыя дрэўцы. Вера Месячык дзякавала Надзеі Васільеўне за кнігі па пчалярству, Алена Міхно — за падшыўку часопіса «Лён і каноплі».

Але не толькі за гэта паважаюць у вёсцы Надзею Васільеўну. Нягледзячы на тое, што ёй ужо далёка за пяцьдзесят, летась яна ўзначаліла ільнаводчае звяно. Ураджай быў сабраны нядрэнны: па чатыры цэнтнеры валакна з гектара.

Цяпер звяно Надзеі Васільеўны рыхтуецца да вясны. Работы шмат. Але жанчына не забывае і пра свой грамадскі абавязак. Вечарамі ў яе хаце поўна народу. Сядзяць часам да дванаццаці ночы. Чалавек светлай душы, старанная і працавітая, Надзея Васільеўна сама горача любіць кнігу і ў меру сіл сваіх прывучае дружыць з кнігай сваіх аднавяскоўцаў.

Тэкст і фота П. ЖАРСКАГА.

Ваўкавыскі раён.

КНІЖНЫ АБМЕН— ЗАРУКА ДРУЖБЫ

«МІЖНАРОДНАЙ КНІЗЕ» — 40 ГАДОЎ

У красавіку 1923 года ў СССР было створана ўсесаюзнае гандлёвае аб'яднанне «Міжнародная кніга». Ужо тады прагрэсіўныя людзі многіх краін свету імкнуліся як мага больш даведацца пра Савецкі Саюз і яго народ. Гэтаму і садзейнічалі выданні, якія накіроўваліся за рубеж «Міжнароднай кнігай».

З кожным годам памнажаліся сувязі СССР з зарубежнымі краінамі. Расла і кнігагандлёвая справа. 25 мільярдаў экземпляраў — такі тыраж кніг, выдадзеных за гады Савецкай улады. Выдавецтвы Савецкага Саюза выпускаюць штогод больш 70 тысяч кніг розных назваў на 89 мовах народаў СССР і на 49 — народаў зарубежных краін.

Павелічэнне выпуску твораў друку садзейнічала пашырэнню дзелавых сувязей «Міжнароднай кнігі» з зарубежнымі краінамі. Мільёны людзей знаёмяцца з Савецкім Саюзам па кнігах савецкіх выдавецтваў. Кнігі збліжаюць народы, дазваляюць ім лепш пазнаць адзін аднаго. У нашы дні «Міжнародная кніга» пастаўляе кнігі, брашуры, газеты і часопісы больш чым 80 краінам.

Сістэматычна развіваліся і ўдасканальваліся і формы дзелавых сувязей «Міжнароднай кнігі». Ад продажу невялікіх партый літаратуры аб'яднанне перайшло да гандлю друкаванай прадукцыяй на базе гандлёвых пагадненняў і доўгатэрміновых кантрактаў.

Кнігі, часопісы, газеты, грампласцінкі, паштовыя маркі і іншую прадукцыю, якая ўваходзіць у наменклатуру «Міжнароднай кнігі», можна ўбачыць цяпер у многіх магазінах зарубежных краін. Адкрыты спецыялізаваныя магазіны з шыльдамі «Тут прадаюцца савецкія кнігі». Такія магазіны ёсць у Рыо-дэ-Жанейра, Парыжы, Лондане, Хельсінкі, Джакарце, Лейпцыгу, Сафіі, Празе і іншых гарадах.

Гандлёвыя арганізацыі і ўладальнікі гэтых магазінаў падтрымліваюць пастаянны і цесны кантакт з «Міжнароднай кнігай». Савецкае кнігагандлёвае аб'яднанне імпартуе таксама кнігі, часопісы, газеты, грампласцінкі і іншую друкаваную прадукцыю.

«Міжнародная кніга» стала пастаянным удзельнікам многіх міжнародных кірмашоў і выставак, прымае ўдзел і ў спецыялізаваных міжнародных кніжных кірмашах. Сёлета прадукцыя нашых выдавецтваў і заводаў грампласцінак будзе прадстаўлена на выстаўках і кірмашах у Франкфурце-на-Майне і Белградзе, у гарадах Пакістана і іншых краін свету.

Цесныя дзелавыя кантакты з выдавецтвамі і кнігагандлёвымі фірмамі амаль ва ўсіх краінах свету даюць магчымасць «Міжнароднай кнізе» распаўсюджваць шырокую інфармацыю, якая забяспечвае атрыманне заказаў на дзесяткі тысяч розных выданняў.

Усё больш і больш савецкіх кніг паяўляецца ва ўсіх краінах свету. Сярод іх вялікае месца займае грамадска-палітычная літаратура, асабліва творы класікаў марксізма-ленінізма. Ва ўсіх краінах з вялікай цікавасцю сочаць за выступленнямі М. С. Хрушчова. Гэтыя выступленні публікуюцца ў зборніках, якія шырока распаўсюджваюцца за рубяжом. Вялікім попытам карыстаюцца матэрыялы XXII з'езда КПСС, новая Праграма КПСС. Яны перакладзены на многія мовы.

Усё большую папулярнасць набывае ва ўсіх краінах свету савецкая навукова-тэхнічная літаратура. Штогод зарубежным спецыялістам прапануюцца працы савецкіх вучоных па гісторыі, філасофіі, эканоміцы, навуковым атэізме, аўтаматыцы, радыёэлектроніцы, металазнаўству, металаапрацоўцы, машынабудаванню, транспарту, сувязі і па іншых галінах.

Шмат заказаў атрымлівае «Міжнародная кніга» на выпускаемыя ў Савецкім Саюзе слоўнікі. Выдавецтва замежных і нацыянальных слоўнікаў ужо выпусціла 650 слоўнікаў на 87 мовах тыражом каля 35 мільёнаў экземпляраў. У 1963 годзе выдаецца рад новых слоўнікаў: нарвежска-рускі, італьянска-рускі, руска-фінскі, руска-японскі, французска-рускі фразеалагічны.

Сусветнае прызнанне атрымала савецкая мастацкая літаратура. За гады існавання «Міжнародная кніга» накіравала зарубежным чытачам сотні тысяч экземпляраў твораў вялікага савецкага пісьменніка Максіма Горкага. Папулярныя сярод зарубежных выдаўцоў Уладзімір Маякоўскі, Аляксей Талстой, Міхаіл Шолахаў, Леанід Ляонаў, Міхаіл Стэльмах, Юхан Смуул. Высокае прызнанне атрымалі за рубяжом творы савецкіх паэтаў Аляксандра Твардоўскага, Самуіла Маршака, Аляксандра Пракоф'ева і многіх іншых.

Экспартны каталог «Міжнароднай кнігі» ўключае больш 1000 назваў газет і часопісаў.

На англійскай, французскай і іспанскай мовах выпускаецца газета «Маскоўскія навіны». Сярод часопісаў шырока вядомы «Советский Союз», які выходзіць на 12 мовах, «Советская женщина» — на 10 мовах. Багаты мастацкі свет адкрываюць перад чытачамі многія літаратурна-мастацкія часопісы на рускай мове.

Для зарубежных кліентаў, якія заказваюць літаратуру, грамафонныя пласцінкі, паштовыя маркі, газеты і часопісы, «Міжнародная кніга» выпускае і рассылае розныя інфармацыйныя матэрыялы і каталогі. Інфармацыя аб кнігах на рускай мове публікуецца ў штотыднёвым бюлетэні «Новыя кнігі» і ў тэматычных каталогах раду выдавецтваў. Заказы накіроўваюцца кнігагандлёвымі фірмамі, якія маюць дзелавыя сувязі з усесаюзным аб'яднаннем «Міжнародная кніга».

АДН.

Добра арганізавана культурна-асветная работа ў клубе саўгаса «Даўгоўскі» Кіраўскага раёна. Рабочыя прыходзяць сюды паслухаць лекцыю ці гутарку, перад імі часта выступаюць перадавыя механізатары, жывёлаводы. У клубе рэгулярна дэманструюцца мастацкія і навукова-папулярныя фільмы. Вялікім аўтарытэтам сярод хлебаробаў карыстаецца мастацкая самадзейнасць клуба. Тут працуюць харавы, танцавальны, музычны і драматычны гурткі. Самадзейныя артысты выступаюць з канцэртамі ў клубе, а таксама выязджаюць у брыгады і аддзяленні.

Усёй работай сельскага клуба кіруе настаўнік 8-гадовай Загацкой школы Пятро Кузьміч Клепча.

Фотакарэспандэнт БЕЛТА Н. Жалудовіч зняў Пятра Кузьміча Клепчу (справа) у час гутаркі з удзельнікамі музычнага гуртка Герасімам Аляксеевічам Клепчам і Міхаілам Апанасавічам Голубам.

Насустрач юбілею Гашака

У красавіку спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння Яраслава Гашака, выдатнага чэшскага сатырыка, аўтара «Прыгод бравага салдата Швейка».

У гады грамадзянскай вайны ў СССР Я. Гашак прымаў непасрэдны ўдзел у баях за ўладу Саветаў. Яго імя стала сімвалам непарушнай дружбы савецкага і чэхаславацкага народаў, сімвалам кроўнай сувязі дзвюх братніх літаратур. Юбілей чэшскага пісьменніка шырока будзе адзначаны ў нашай краіне. Член прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі Р. Собалеў расказаў нашаму карэспандэнту:

— з 15 па 30 красавіка ў рэспубліцы будуць праводзіцца мерапрыемствы, звязаныя з ушанаваннем памяці выдатнага байца-інтэрнацыяналіста. Гашакаўскія чытанні, гутаркі аб жыцці і творчасці, вечары арганізуюць аддзяленні Таварыства савецка-чэхаславацкай дружбы на заводзе аўтаматычных ліній, падшыпнікавым заводзе і піўзаводзе «Беларусь» у Мінску, на фабрыцы «КІМ» у Віцебску, у інстытуце чыгуначнага транспарту ў Гомелі.

Вялікі агульнагарадскі вечар з удзелам грамадскасці адбудзецца ў Мінску. На вечары выступяць пісьменнікі, якія перакладалі творы Я. Гашака на беларускую мову.

На сюжэты твораў Я. Гашака створаны фільмы «Камічныя апавяданні Гашака», «Прыгоды бравага салдата Швейка», «Бравы салдат Швейк», «Швейк на фронце», «Вялікая дарога», «Сур'ёзныя дзівацтвы». У юбілейныя дні яны будуць дэманстравацца на экранах кінатэатраў, у клубах і палацах культуры. Мінскі тэлевізійны цэнтр прысвячае 80-годдзю з дня нараджэння пісьменніка перадачу ў серыі «Памятныя даты».

Таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі рыхтуе фотавыстаўку, прысвечаную Яраславу Гашаку. Выстаўкі твораў пісьменніка, выдадзеных у Савецкім Саюзе, у тым ліку ў Беларусі, адкрываюцца ў Дзяржаўнай бібліятэцы імя Ул. І. Леніна, у абласных і гарадскіх бібліятэках, у бібліятэцы Дома афіцэраў.

БЕЛАРУСКІ АРКЕСТР НА КАЎКАЗЕ

Яшчэ зусім нядаўна беларускія песні і музыка гучалі далёка на Урале, а цяпер Дзяржаўны народны аркестр БССР гастраліруе ля падножжа Каўказскіх гор.

Краснадар сустрэў беларускіх артыстаў яркім вясновым сонцам. Тут калектыў выступіў у Палацы культуры завода вымяральных прылад, чыя прадукцыя вядома далёка за межамі нашай краіны. Потым адбыліся канцэрты ва ўсесаюзных здраўніцах Кіславодска, Есентукоў, Пяцігорска.

У свой гастрольны рэпертуар аркестр уключыў некалькі праграм.

На эстрадах рэспублік Каўказа і Закаўказзя прагучала «Сімфаньета» М. Чуркіна і «Фантазія на беларускія тэмы» Я. Глебава, «Беларускія напевы» Д. Камінскага, тры народныя песні для аркестра—«Купаленька», «Перапёлачка» і «Полька», «Маладзёжнае скерца» Ул. Чараднічэнкі, беларускія танцы І. Жыновіча. Апроч беларускай музыкі, у праграму канцэртаў уключаны творы кампазітараў Грузіі, Арменіі, Азербайджана.

Вялікім поспехам карыстаюцца выступленні салісткі Белдзяржфілармоніі Л. Шубінай, якая выконвае беларускую песню «Чабарок», песню Ю. Семянякі «Беларусь мая».

Народны аркестр БССР выступіў у сталіцах: Кабардзіна-Балкарыі — Нальчыку, Паўночнай Асеціі — Арджанікідзе, Дагестана — Махач-Кале, Чэчэна-Інгушыі — Грозным.

Гастролі па Каўказе і рэспубліках Закаўказзя праходзяць з вялікім поспехам. Наперадзе выступленні ў Баку, Ерэване, Сухумі, Сочы.

М. РУБІНШТЭЙН.

г. Грозны.

ПАСЛЯ ДЭБЮТУ

П'есай пачынаючага беларускага драматурга П. Дабравольскага «Вартыя шчасця», створанай ім у садружнасці з калектывам Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра, зацікавіўся Сяміпалацінскі абласны драматычны тэатр. Спектакль, пастаўлены галоўным рэжысёрам М. Лабунскім, паўгода з поспехам ідзе на сяміпалацінскай сцэне.

«Прииртышская правда» ў рэцэнзіі на спектакль адзначае, што ў ім «са сцэны павеяла неўміручай рамантыкай векапомных вогненных гадоў» грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. «У цэлым, — пішуць рэцэнзенты С. Клёнаў і Е. Янкоўская, — спектакль добры, цікавы, з моцным патрыятычным полымем і высокім гуманістычным пафасам».

Гэтую ж п'есу нядаўна паставілі ў Гомелі ўдзельнікі самадзейнага тэатра Палаца культуры механізаванага шклозавода. Пастаноўкай спектакля кіраваў сам аўтар. Заводская шматтыражка «Новатор» змясціла кароткую рэцэнзію на прэм'еру, у якой віншуе драматурга і рэжысёра з заслужаным поспехам і выказвае «надзею, што яго плённая работа з нашым драматычным калектывам не абмяжуецца пастаноўкай толькі гэтага спектакля».

Л. БРАНАВІЦКІ.

ДЗІЦЯЧАЯ МУЗЫЧНАЯ

Так называецца брашура аб вопыце работы Мінскай дзіцячай музычнай школы № 2, якую выпусціў нядаўна Рэспубліканскі метадычны кабінет культасветработы. У брашуры расказваецца, што ў школе займаецца 500 навучэнцаў па дваццаці спецыяльнасцях. Юныя музыканты маюць свае самадзейныя калектывы цымбальнага, струннага, духавога і іншых аркестраў. Яны выступалі ў Вільнюсе, Барысаве, Слуцку, Лагойску.

Школа падтрымлівае сувязь з музычнымі школамі Кіева і Шанхая, Рыгі і Брно, Тбілісі і Сафіі. Паведамляецца таксама пра школьны музей музычнай культуры беларускага народа, які стварылі вучні. Экспанаты для яго прыслалі Цэнтральны музей музычнай культуры імя М. Глінкі, народныя артысты СССР Р. Шырма і Л. Александроўская, кампазітары Д. Шастаковіч, Д. Кабалеўскі, М. Чуркін, Ул. Алоўнікаў, Д. Лукас і іншыя.

БІБЛІЯТЭКІ РЭСПУБЛІКІ В'ЕТНАМ

Ван ДЗІНЬ

З 1955 года, праз некалькі месяцаў пасля ўстанаўлення міру, бібліятэчнай справе ва В'етнаме аддаюць вялікую ўвагу.

Цэнтральная бібліятэка была пераўтворана ў Нацыянальную бібліятэку Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Фонды кніг, газет і часопісаў хутка папоўніліся. Са 100 000 тамоў у момант заснавання бібліятэкі цяпер яе фонды павялічыліся да 600 000. Толькі паступленні перыядычных выданняў павялічыліся з 1 885 назваў да 4 000.

Старыя фонды кніг і газет былі пераразмеркаваны. Побач з фондам в'етнамскай літаратуры, які ахоплівае ўсе галіны ведаў, ёсць яшчэ і фонд замежнай літаратуры і перыядычных выданняў, створаны ў 1956 годзе; з таго часу ён штодзённа папаўняецца. Цяпер у бібліятэцы налічваецца больш 100 000 тамоў на рускай, кітайскай мовах, 20 000 кніг на французскай мове, больш 6 000 — на англійскай і нямецкай мовах і г. д.

Трэба адзначыць, што ў сховішчах Нацыянальнай в'етнамскай бібліятэкі ёсць кнігі і газеты на ўсіх мовах і асабліва многа на в'етнамскай, камбаджыйскай, лаацьенскай і французскай, выдадзеныя на працягу амаль цэлага стагоддзя. Гэта каштоўная крыніца звестак для тых, хто імкнецца глыбока вывучыць гісторыю Індакітая гэтага перыяду.

У чытальных залах і залах выдачы кніг на дом побач з французскім каталогам, якім карыстаюцца звычайна для старых фондаў, знаходзіцца каталог новай сістэмы з імёнамі аўтараў, загалоўкамі, сфармуляванымі на в'етнамскай мове (або напісанымі в'етнамскімі літарамі, калі гаворка ідзе пра замежнага аўтара) і шыфрам. Усё гэта, каб задаволіць новыя патрэбы шырокіх мас чытачоў.

Апроч таго, колькасць месц у чытальнай зале павялічылася да 400, а пры каланіяльным рэжыме тут было толькі 129 месц. Цяпер у бібліятэцы бывае больш 1 000 наведванняў за дзень.

Фонд кніг і перыядычных выданняў аддзела выдачы кніг на дом таксама вельмі хутка павялічыўся і ўжо ў канцы 1956 года налічваў 75 563 тамы. У сярэднім кожны месяц бібліятэка выдае больш 10 000 кніг і часопісаў.

У лютым 1960 года бібліятэка адкрыла яшчэ адну чытальную залу, прызначаную для школьнікаў. У гэтай зале 60 месц, а кніжны фонд залы налічвае 19 126 кніг.

У 1960 годзе была створана перасоўная бібліятэка, дзе цяпер ужо 20 000 тамоў. Штодзённа яна абслугоўвае маленькія бібліятэкі на заводах, на будоўлях або ў сельскагаспадарчых кааператывах, у прыгарадах Ханоя.

У канцы 1958 года ў Нацыянальнай бібліятэцы адкрыўся аддзел на 50 рабочых месц, у якім створаны ўсе неабходныя ўмовы для работы спецыялістаў.

Што датычыць культурных сувязей з заграніцай, дык Нацыянальная бібліятэка звязана з 48 бібліятэкамі 38 краін, сярод якіх і краіны сацыялізма і многія іншыя краіны, такія як Англія, Аўстралія, Бірма, Данія, Індыя, Інданезія, Ірак, Францыя, Японія, Камбоджа, Мальгашская Рэспубліка, Марока, Мексіка, Нарвегія, Новая Каледонія, Швейцарыя і г. д.

У розных гарадах і правінцыях Паўночнага В'етнама налічваецца да 34 мясцовых грамадскіх бібліятэк, фонд кніг і перыядычных выданняў у якіх павялічыўся ад 10 000 да 60 000 тамоў. Налічваюцца 102 чытальныя залы ў раённых цэнтрах, у розных установах, на заводах, на будоўлях, у сельскагаспадарчых кааператывах у школах і ваенных часцях.

Пачынаючы з 1960 года, у многіх бібліятэках у правінцыях і гарадах пачалі адкрывацца чытальныя залы для школьнікаў.

У гэтым жа годзе была заснавана Цэнтральная навуковая бібліятэка, у якой больш чым 200 тысяч кніг, і таксама каля 90 падпарадкаваных ёй спецыяльных бібліятэк у міністэрствах, у аддзелах міністэрстваў, у інстытутах і ва універсітэтах.

Трэба яшчэ дадаць, што, пачынаючы з 1960 года, былі арганізаваны шматлікія публічныя бібліятэкі і чытальныя залы ў горных і пагранічных раёнах і на прыбярэжных астравах.

Увогуле колькасць кніг у вялікіх і малых народных бібліятэках Паўночнага В'етнама дасягнула цяпер чатырох мільёнаў тамоў.

Вельмі шкада, што з-за палітыкі падзелу краіны мы не звязаны з бібліятэкамі Паўднёвага В'етнама. Мы не маглі абменьвацца кнігамі і перыядычнымі выданнямі, а таксама дзяліцца прафесіянальным вопытам, нягледзячы на неаднаразовыя прапановы нашага Міністэрства культуры.

У чаканні ўз'яднання краіны, якое рана ці позна адбудзецца, народныя бібліятэкі гарадоў і правінцый Паўночнага В'етнама ствараюць фонды кніг і перыядычных выданняў для бібліятэк Паўднёвага В'етнама. Бібліятэка Ханоя, напрыклад, стварае кніжны фонд, так званы «брацкі фонд», для бібліятэк Сайгона і Хуэ, бібліятэкі Хайфона — для бібліятэкі Да Нанг (Туран), бібліятэка Нге Ан — для бібліятэкі Куанг Нгай.

Увогуле гэтыя «брацкія фонды» кніг і перыядычных выданняў налічваюць цяпер больш 200 000 тамоў і пастаянна павялічваюцца.

Бюлетэнь «Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам».

ЯК РАСПАЛАСЯ НАША СУПОЛКА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

ужо без мяне. Ездзіў тыдзень, пачаў нешта запісваць. А месяца праз тры прыляцеў да мяне ўзрушаны:

— Ведаеш што, Міхась? Давай, брат, разам засядзем за павястушку ці раман пра трактарабудаўнікоў.

— Давай.

Роўна а дзевятай гадзіне раніцы я заходзіў да яго на кватэру, і мы адразу ж садзіліся за стол. Больш правільна, садзіўся хто-небудзь адзін, узяўшы ў рукі аловак ці самапіску. А другі тым часам хадзіў з кута ў кут і, як настаўнік на ўроку, дыктаваў свае думкі. Потым абмяркоўвалі напісанае, спрачаліся, выкрэслівалі, што нам не падабалася, перараблялі цэлыя старонкі.

Работа, трэба сказаць, пасоўвалася не вельмі. Часта мы спрачаліся за адзін які сказ ці нават слова па паўгадзіны, а то і больш.

— Менш тэксту, больш падтэксту! — павучальным тонам гаварыў мне Віктар Сцяпанавіч.

За тыдзень мы напісалі толькі адзін раздзел. Я прапанаваў працаваць паасобку, а потым ужо ўзгадняць разам. Работа пайшла хутчэй. Віктар Сцяпанавіч ажыў. Ён нават адмовіўся ехаць са Стронгам на рыбалку. Стронга па-ранейшаму касавата паглядаў на мяне, калі я чытаў напісаны мною раздзел, але мяне гэта мала абыходзіла. Мяне захапляла праца над творам.

Я ведаў людзей, якія пачалі працаваць рознарабочымі, а потым сталі выдатнымі слесарамі, токарамі, майстрамі, інжынерамі. Адзін з іх, былы палескі калгаснік, цяпер часта ездзіць у замежныя камандзіроўкі. Нядаўна выступаў на тэлестудыі, расказваў пра свае сустрэчы ў Афрыцы, у Паўднёвай Амерыцы, на Інданезійскіх выспах.

— Ну, пра гэта ў аповесці нам не варта пісаць, — сказаў мой напарнік, бязлітасна камечачы і кідаючы ў кошык гатовыя старонкі. — Ніхто не паверыць.

І тут паміж намі пачаліся сутычкі.

— Ты звар'яцеў! Хто не паверыць?

— Доктар.

— Які доктар?

— Адам Стронга, — спакойна растлумачыў напарнік. — Скажа ў друку, што гэта ідэалізацыя героя, лакіроўка рэчаіснасці.

— Глупства нейкае. Зараз жа даставай старонкі з кошыка!

— І не падумаю.

— Ну што ж, тады я сам дастану!

— Даставай. Толькі я здымаю з сябе ўсялякую адказнасць.

— Бывай здароў...

Дзень быў сапсаваны.

Увечары Балабошка пазваніў мне і папярэдзіў, каб я заўтра не прыходзіў. Адам Стронга падбіў яго «злятаць» на шчупакоў. Вельмі ж ужо разбушаваліся, заразы, пасля нерасту!

Вярнуўся Віктар Сцяпанавіч толькі праз тры дні. Калі я прыйшоў да яго, ён стаяў ля акна, за якім высіліся голыя таполі. На адной з тапаляў было недамошчанае галчына гняздо.

— Ну, здорава папрацаваў без мяне? — запытаўся Віктар Сцяпанавіч, як мне здалося, без асаблівай цікавасці. — А мы, брат, такую смакату-юшку варылі!

— Дык можа хоць цяпер падгонім работу? Сядай за стол і прачытай новы раздзел.

— Пачакай трошкі, — адказаў Віктар Сцяпанавіч. — Разумееш, некаторыя сцвярджаюць, што чорная варона дурная птушка. А гэта няпраўда!

— Пры чым тут варона? Якія яна мае адносіны да нашай працы?

У гэты момант праз расчыненую фортку акна мы пачулі дзікі галчын лямант, віхурысты пошум мноства крылаў у паветры.

— Бачыш, што робіцца! — расхліставаючы акно, закрычаў Віктар Сцяпанавіч. — Хутчэй сюды!

Я выглянуў на двор. Высока ў паветры, сярод цэлай хмары разгневаных галак, ашалела кідалася туды-сюды варона. Яна то каменем падала ўніз, то ўскручвалася ўгору, стараючыся прарвацца праз жывую і грозную заслону. З усіх бакоў, нібы ўзнятыя па трывожнаму сігналу, зляталіся ціхамірныя, але рухавыя птушкі, каб з ходу рынуцца ў бітву з разбойніцай.

— Ты не думаеш, што тут ёсць нешта свядомае, арганізаванае? — запытаўся мой сябра. — Глядзі, глядзі, варона нырнула ў крону ясеня! Уся аж калоціцца ад страху... Далі гадаўцы пытлю! Цяпер яна добра падумае перад тым, як перціся расцягваць чужое гняздо!

— Вось, брат, дзе тэма, дзе матэрыял, — дадаў ён.

Дні праз два Віктар Сцяпанавіч чытаў мне апавяданне пра варону і галак. Яно поўна было трагедыі, душэўнага ляманту і глыбокіх псіхалагічных віроў. У ім пакутвалі і весяліліся, плакалі і рагаталі абагуленыя птушкі. А яшчэ праз дзень Віктар прапанаваў мне:

— Заканчвай нашу павястушку пра трактарабудаўнікоў адзін. Гэта не мая стыхія.

— Што ты вярзеш... — запратэставаў я.

— Не і не! Я, брат, наважыў заняцца жывёламі і птушкамі. У мяне на чарзе задумы пра верабейчыкаў, якіх, прыляцеўшы з выраю, без аніякага жалю, выкурылі са сваёй хаткі шпакі. Потым ёсць гатовы сюжэт пра мушку.

А надоечы Віктар званіў мне і пытаўся, як больш правільна перадаць голас галак: «цяўк» або «ціўк»?

— Навошта гэта табе? Апавяданне ж ужо надрукавана. Сам Адам Стронга яго пахваліў.

— Бачыш, я напісаў па ім лібрэта оперы. Там спявае хор чорных галак. Дык трэба, каб іх галасы былі якраз такія, як і ў жыцці.

— Пішы, Віктар Сцяпанавіч, «цяўк». А вароны ведаеш, як спяваюць?

— Ка-ар, ка-ар, — пачуў я вясёлы голас з трубкі.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 09846